# КАНТЫНУУМ ГУКАВОГА ГВАЛТУ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ*

Павел Няхаеў

SONIC VIOLENCE CONTINUUM IN CONTEMPORARY BELARUS

© Pavel Niakhayeu

Independent researcher, MA in Sociology.

E-mail: pavel.niakhayeu@gmail.com
ORCID ID: 0000-0002-8014-3954

*Abstract*: This article analyses the use of sound — music, noise, and vocalization — within the context of politically motivated violence in Belarus since 2020. The goal of this study is to analyze the sonic violence practices and map their range.
The first part of the text reviews literature about the use of sound and music for public space control, political indoctrination and "re-education", interrogations, tortures, and executions by various — not only authoritarian — political regimes. The concept of sonic violence used in the following analysis, allows studying the use of musical and non-musical sounds, and focusing not only on external sonic influence but also on victims' own voices weaponized and used against them.
Since 2020, Belarusian pro-democratic media and human rights initiatives have gathered hundreds of interviews with people who underwent harsh treatment and violence from "law enforcers". Many witnesses mention experiencing forced listening, speaking, chanting, singing, and other kinds of sonic violence. The article's second part presents a qualitative analysis of publications in independent and state-funded media (2020–2023), reports of human rights NGOs, as well as other empirical materials (audio recordings, participant observations) that identify situations where sound, music, and vocalization were used by various Belarusian state agents in a coercive or violent context. Coding and categorizing such cases allows

* Артыкул падрыхтаваны пры падтрымцы праекта Science At Risk і Федэральнага міністэрства замежных спраў Германіі.

This work is licensed under a Creative Commons Attribution-Noncommercial-No Derivative Works 4.0 International License

creating a typology that can be mapped as a continuum — according to the character, intensity, duration, and impact of violent techniques and traumatic experiences caused by them.
This is the first study of sonic violence in contemporary Belarus, that not only shows its widespread and systemic character, but also analyzes its forms and strategies used to counteract it. The study shows the place of the current Belarusian events in the history and genealogy of sonic violence, revealing parallels with similar practices of other political regimes, both contemporary and historical.

*Keywords*: sonic violence, music torture, voice weaponization, forced singing, ostensible listening, political repressions, Belarus.

## Уводзіны

З 2020 года, ад пачатку маштабных рэпрэсій супраць удзельнікаў палітычных пратэстаў у Беларусі, недзяржаўныя медыя і праваабаронцы сабралі сотні сведчанняў людзей, што пацярпелі ад гвалту з боку розных "сілавых" службаў. Апроч досведу фізічнага гвалту, жорсткага абыходжання і прыніжэння, яны згадваюць катаванні гучным гукам, досвед прымусовай вакалізацыі — прымус гаварыць, выкрыкваць лозунгі, спяваць — і іншыя прыклады гукавога гвалту.

Мэты артыкула — прааналізаваць практыкі выкарыстання гуку — музыкі, шуму і вакалізацыі — у кантэксце палітычна-матываванага гвалту ў сучаснай Беларусі, вывучыць досвед людзей, што сутыкнуліся з ім, картаграфаваць кантынуум форм гукавога гвалту і паказаць месца сучасных беларускіх падзей у сусветнай гісторыі гвалтоўнага выкарыстання гуку.

Акадэмічная літаратура сведчыць, што розныя — не толькі аўтарытарныя — палітычныя рэжымы ўжываюць гук дзеля кантролю публічнай прасторы, падчас допытаў і катаванняў. Гук часта выкарыстоўваюць разам з фізічным гвалтам, тэхнікамі жорсткага абыходжання (пакутлівымі позамі, дэпрывацыяй сну, холадам і інш.) і метадамі псіхалагічных маніпуляцый, бо ён мае не толькі псіхалагічнае, але і цялеснае ўздзеянне. Гучныя шум і музыка выклікаюць імгненныя фізіялагічныя рэакцыі, могуць мець доўгатэрміновыя наступствы для ментальнага і фізічнага здароўя. "Нелетальная" гукавая зброя можа траўмаваць і нават забіць. Прымусовая вакалізацыя можа быць разбуральнай для ідэнтычнасці асобы (Birch 2021).

Гэты артыкул з'яўляецца часткай больш шырокага даследавання беларускага палітычнага гукавога ландшафту, ролі музыкі

і музыкаў у палітычных падзеях. Падчас працы над ім я знайшоў мноства публікацый пра злоўжыванне гукам, музыкай і прымусовую вакалізацыю, што сведчыла пра сістэмнасць гэтай з'явы. Аналіз літаратуры пра гукавы гвалт у іншых краінах выявіў паралелі паміж гвалтоўнымі практыкамі гэтых рэжымаў і сучаснага беларускага, што выклікала неабходнасць падрабязна прааналізаваць беларускія матэрыялы. Спадзяюся, гэтае даследаванне прыцягне большую ўвагу навукоўцаў, праваабаронцаў і шырокай публікі да тэмы гукавога гвалту, дапаможа змагацца супраць яго і аказваць падтрымку пацярпелым.

## Агляд літаратуры

За апошнія дзесяцігоддзі выйшла мноства даследаванняў акустычнага ці гукавога гвалту, у тым ліку "музычных катаванняў", у якіх разгледжаныя сучасныя і гістарычныя прыклады выкарыстання гуку ў кантэксце палітычна-матываванага гвалту. Даследчыкі прапануюць шэраг канцэпцый для аналізу такіх практык, выпрацоўваюць іх дэфініцыі, юрыдычную аснову для іх ідэнтыфікацыі і забароны. У гэтым артыкуле я ўжываю тэрмін "гукавы гвалт" (sonic violence), які дазваляе ахапіць і музычныя, і немузычныя гукі, сфакусавацца не толькі на знешнім гукавым уздзеянні, але і на выкарыстанні супраць ахвяр іх уласных галасоў.

Шырокай публіцы стала вядома пра гукавы гвалт у пачатку 2000-х, калі стала вядома пра злоўжыванні з боку войскаў і спецслужбаў ЗША супраць падазраваных у тэрарызме. На вайсковых базах і ў сакрэтных турмах па-за юрысдыкцыяй ЗША — у Афганістане, Іраку, на Кубе (Гуантанама), нават у Польшчы і Літве трымалі сотні людзей, супраць якіх, апроч іншых метадаў допытаў, жорсткага абыходжання і катаванняў, ужывалі гучную музыку, шум і сэнсарную дэпрывацыю. Але гук выкарыстоўвалі дзеля "ламання" падазраваных з сярэдзіны XX стагоддзя, і цяперашнія практыкі, заснаваныя на тэхніках часоў "халоднай вайны", што былі тэарэтычна абгрунтаваныя, практычна адпрацаваныя і апісаныя ў шэрагу "дапаможнікаў" для афіцэраў CIA, арміі ЗША і спецслужбаў саюзных дзяржаў, найперш у Лацінскай Амерыцы.

Артыкул Suzanne Cusick (2008) заснаваны на інтэрв'ю з тымі, хто перажыў гукавы гвалт, і з амерыканскімі вайскоўцамі, што праводзілі допыты. Выкарыстанне гучнай музыкі — стандартны элемент "жорсткіх допытаў", мэта якіх — выклікаць адчуванне марнасці супраціву: "як сэнсарная дэпрывацыя, так і сэнсарная перагрузка могуць быць надзвычайна хуткім спосабам зламаць псіхалагічную здольнасць арыентавацца ў рэальнасці, адрозніваць галюцынаторнае ад сапраўднага ці супраціўляцца допытам" (Cusick 2008: 4).

Амерыканскія вайскоўцы так тлумачылі эфект гучнай і жорсткай музыкі: "Гэтыя людзі раней не чулі цяжкага металу. [...] Калі круціць ім яго 24 гадзіны, мозг і функцыі цела пачынаюць саслізгваць, ланцужок думак запавольваецца і воля ламаецца. Вось тады мы заходзім і гаворым з імі" (Piore 2003).

Cusick адзначае, што пытанне юрыдычнай дэфініцыі катаванняў "гэта, магчыма, няправільнае пытанне". У некаторых краінах, дзе выкарыстоўвалі гукавы гвалт, да пэўнага часу не было ані юрыдычных дэфініцый катаванняў, ані адпаведных крымінальных артыкулаў. Grant (2014) адзначае, што з'яўленне заканадаўства пра правы чалавека — Дэкларацыі праў чалавека 1948 і Канвенцыі супраць катаванняў 1984 — прывяло да распаўсюду "бескантактных" практык, якія фармальна складана ахарактарызаваць як катаванні (no-touch torture, Weiße Folter)[1]. Сярод такіх практык — сэнсарная дэпрывацыя і ўздзеянне шумам і гучнай музыкай. Усё гэта, напрыклад, выкарыстоўвалі брытанцы супраць вязняў у Паўночнай Ірландыі (Hennessy 2014). Еўрапейскі Суд па правах чалавека пастанавіў, што гэтыя меры з'яўляюцца формай негуманнага і прыніжальнага абыходжання і парушаюць Еўрапейскую канвенцыю па правах чалавека. Камітэт супраць катаванняў ААН у справаздачы па справе супраць Ізраіля класіфікаваў гэтыя і падобныя меры менавіта як катаванні (Grant 2014: 7). "Стамбульскі пратакол" (Office of the UN 2022) лічыць розніцу паміж фізічнымі і псіхалагічнымі катаваннямі штучнай і адносіць да катаванняў і сэнсарную дэпрывацыю, і сэнсарную перагрузку (у тым ліку гукавую).

Незалежна ад таго, класіфікуецца працяглае ўздзеянне гучнай музыкай і шумам як катаванні, альбо жорсткае, бесчалавечнае і прыніжальнае абыходжанне (UN General Assembly 1984: 85) (таксама забароненае міжнародным заканадаўствам), яно з'яўляецца гвалтоўным і мае сур'ёзныя наступствы. Так, Мугамад аль-Катані страціў кантакт з рэальнасцю і не змог абараняць сябе ў судзе. Грамадзяніна ЗША Доналда Вэнса, які збіраў для FBI інфармацыю пра нелегальны гандаль зброяй і карупцыю амерыканскіх кампаній і войска ў Іраку, катавалі музыкай некалькіх месяцаў. Пасля вызвалення ён пакутаваў ад трывогі, правакаванай гукам, разладаў сну і харчавання, параноі, агарафобіі і іншых сімптомаў ПТСР. Але, па ягоных словах, ён не звар'яцеў, бо ведаў, што мэтай гучнай музыкі было "замаскаваць", падавіць думкі, таму ён разумеў, як супрацііўляцца: трэба ўвесь час весці дыялог з сабой, трымаць фокус на ім (Cusick 2008: 24).

Артыкул Morag Grant (2014) разглядае гістарычны кантэкст музычных катаванняў — дысцыплінарную ролю музыкі ў войску,

1 ЗША прынялі папраўкі да Канвенцыі супраць катаванняў, абмежаваўшы дэфініцыю фізічнымі катаваннямі.

тэхналогіі і стратэгіі бяспекі, функцыі музыкі ў сацыяльных і палітычных рухах, сувязі паміж музыкай і прыніжэннем. Грант выдзяляе дзве фундаментальныя формы музычных катаванняў — прымусовае слуханне і прымусовае выкананне музыкі. Паводле яе, адна з прычын прывабнасці музыкі для катаў — тое, што, у адрозненне ад фізічнага гвалту, вельмі цяжка аргументаваць, чаму музыку можна лічыць катаваннем. Тое, што не ўсе, хто перажыў гвалт, надаюць значэнне выкарыстанню музыкі ў катаваннях, не азначае што гэта "меншае зло". Прымусовае спяванне ў любым выпадку парушае правы зняволеных (Grant 2014: 5).

Аналізуючы генеалогію музычнага гвалту, Грант выдзяляе некалькі траекторый (pathways): траекторыю сэнсарнай дэпрывацыі, вайсковай традыцыі, палітычнай камунікацыі, прыніжэння і дэманстрацыя ўлады. Вайсковая традыцыя дысцыплінарнага гвалту прывяла да выкарыстання музыкі ў канцэнтрацыйных лагерах, а палітычная камунікацыя, заснаваная на пэўным музычным рэпертуары, спарадзіла шматлікія сістэмы перавыхавання, "накіраваныя на навязванне дзяржаўнай ідэалогіі і дактрыны". Грант называе прымусовае спяванне "менш вытанчанай версіяй спробы навязаць дзяржаўную ідэалогію чалавеку, што супраціўляецца" (Grant 2014: 11–12).

Калі даследаванне Cusick датычыцца гукавога гвалту з боку ЗША супраць грамадзян іншых краін, іншыя аўтары аналізуюць гвалт аўтарытарных рэжымаў супраць сваіх грамадзян — палітычных праціўнікаў. Грант (2014) згадвае прыклад Уругвая перыяду хунты 1973–1985 гадоў, якая выкарыстоўвала "шум вельмі гучнай музыкі", што грала дзень і ноч. Вязні мусілі слухаць крыкі іншых ахвяр пад гучны шум і музыку[2]. Чылійская даследчыца Katia Chornik, чыіх бацькоў катавалі пры Піначэце, даўно займаецца тэмай музыкі ў прасторах зняволення.[3] Рэжым Піначэта выкарыстоўваў музыку як "саўндтрэк" да катаванняў і дзеля палітычнай індактрынацыі, але ў справаздачах камісій, што збіралі звесткі пра злачынствы дыктатуры, мала падрабязных звестак — да 2016 года ў Чылі катаванні не разглядалі як асобнае злачынства, таму "камісіі праўды" факусаваліся на фізічным гвалце, што пакідаў бачны след (Chornik 2018: 5). Арыгіналы паказанняў вязняў засакрэчаныя да 2054 года і застаюцца недаступнымі публіцы, толькі ў 2017 годзе іх адкрылі для судоў. Таму даследчыца брала інтэрв'ю ў былых

2 Фільм "Ноч даўжынёй у 12 год" паказвае гісторыю некалькіх уругвайскіх палітвязняў: Brechner Álvaro (Director) (2018). "La noche de 12 años" [A Twelve-Year Night] [Film]: https://imdb.com/title/tt6792282/.

3 Chornik стварыла онлайн-архіў "Песні няволі", дзе збірае сведчанні былых палітычных вязняў: Cantos Cautivos (Captive Songs): https://cantoscautivos.org (доступ 07.10.2023).

вязняў, што сутыкаліся з музычным гвалтам у розных формах: гэта была музыка, што грала ў турмах, песні, што слухалі ці напявалі ахоўнікі падчас катаванняў, прымус спяваць дзяржаўны гімн Чылі і поп-хіты таго часу. (Chornik 2013). Паводле адной са зняволеных, "ты жывеш у бясконцым сеансе катаванняў, таму што, калі не катуюць цябе, ты слухаеш, як катуюць іншых, што было абсалютна невыносна. І ўвесь час пад музыку" (Chornik 2018: 9).

Даследчыца ўзяла інтэрв'ю і ў былога агента чылійскіх спецслужбаў, які працаваў у некалькіх цэнтрах зняволення. Паводле яго, у лагерах вязняў прымушалі да армейскага рэжыму з муштрай і сьпяваннем гімна, каб давесці іх да "кропкі зрыву" і "перавыхаваць". Ён служыў у адной з самых жудасных катавальняў Сант'яга — былой дыскатэцы на Villa Grimaldi, праз якую прайшло каля 5000 чалавек. Поп-музыка была саўндтрэкам да гвалту там і на яшчэ адной былой віле — Venda Sexy ці La Discothéque, дзе практыкавалі сэксуалізаваныя катаванні і згвалтаванні. У разгромленых імі дамах салдаты кралі пласцінкі і магутныя калонкі, якія паставілі ў катавальні — гучная музыка грала цэлымі днямі, каб крыкі не чулі мінакі (Chornik 2013: 60).

Падобныя сведчанні прыводзіць Anna Papaeti ў артыкулах пра Грэцыю часоў грамадзянскай вайны (1946–1949) і "рэжыму палкоўнікаў" (1967–1974). Нягледзячы на сведчанні пра выкарыстанне гуку пры катаваннях, пасля падзення дыктатуры гэтую праблему не высвятлялі на судах, бо "не фізічныя" катаванні не лічыліся злачынствам. Часам суддзі нават перабівалі пацярпелых, заклікаючы іх сфакусавацца на фізічным гвалце і перавышэнні паўнамоцтваў. Papaeti звяртае ўвагу на праблему трываласці памяці: праз дзесяцігоддзі былыя вязні не памяталі ці нават адмаўлялі паказанні, што далі на судах над катамі, бо былі схільныя падаўляць траўматычныя ўспаміны (Papaeti 2013b: 79). Таксама ўдзельнікі супраціву падкрэслівалі ролю музыкі як важнага элементу супрацьстаяння рэжыму і адмаўлялі шкоду ад гукавога гвалту: "рэканструяванне таго, як рэжым злоўжываў музыкай, патрабуе ісці насуперак звязна сканструяваным наратывам, якія непарыўна транслявалі на працягу амаль 40 год" (Papaeti 2013b: 69).

Былыя грэчаскія вязні паведамлялі, што горш за ўсё было слухаць, як катуюць іншых. На Еўрапейскім Судзе па правах чалавека яны расказалі пра "матор" і "гонг", якімі заглушалі крыкі. У "цэнтрах затрымання" ахоўнікі заводзілі матор матацыкла, білі па метале за дзвярыма камер, уключалі электрычны званок, што гучаў гадзінамі, выкарыстоўвалі гучную музыку з радыё і дынамікаў, прымушалі вязняў спяваць. Віргінія Цудэру ўспамінае: "Шум быў часткай пакут. Шум ад налётаў ахоўнікаў, шум ад тэхнічных прылад: здаецца, што цябе атачаюць радыёпрыёмнікі і тэлевізары

з мноствам нескаардынаваных праграм. Ты проста вар'яцееш" (Papaeti 2013b: 75).

Збіваючы вязняў, п'яныя салдаты часта спявалі: "Гэта была іхняя своеасаблівая мова... камунікацыя праз песню. Іншымі словамі: мы з табой катуем гэтага чалавека і маем штосьці супольнае ў гэты момант. Наша супольнае — гэта наша супольная песня, якую мы разам спяваем". Але і салдат падчас навучання прымушалі спяваць і танчыць пад пагрозай катаванняў (Papaeti 2013b: 77–78). Гэта пацвярджае, што прымус да спявання — частка вайсковай традыцыі гвалту ("hazing" — ці "дзедаўшчыны" ў нашым рэгіёне), пра якую піша Grant (2014).

Papaeti даследавала і выкарыстанне музыкі для "перавыхавання" палітычных вязняў — камуністаў і чальцоў іншых левых арганізацый, якіх трымалі на востраве Макранісас з 1947 года і ў "грэчаскім Гулагу" — лагеры Гіарос у 1967–1968. Мэтай "перавыхавання" было прымусіць вязняў адрачыся ад сваіх поглядаў і засведчыць лаяльнасць ураду (Papaeti 2013a: 2–4). Замежныя місіі і журналісты былі ў захапленні ад праграм "перавыхавання" і аркестраў зняволеных. Паводле журналіста *The Guardian*, "дух старажытнай Грэцыі адраджаецца — вітальны, няўрымслівы, поўны веры і надзеі" (Runciman 1949 цытуецца паводле Papaeti 2013: 6). Насамрэч жа, як сказаў вязень, які раней быў у канцлагеры Бухенвальд, на Макранісасе было горш, чым там: "яны спрабуюць адабраць тваю душу, што горш. Там (у Бухенвальдзе) ты ім быў патрэбны для працы. Яны не ўмешваліся ў твой псіхалагічны стан" (Papaeti 2013: 6–7).

Аднак нацысты шырока выкарыстоўвалі музыку ў канцлагерах, і гэтая тэма дастаткова добра даследаваная. Katarzyna Naliwajek-Mazurek (2013) аналізуе сведчанні габрэйскіх і польскіх вязняў канцлагераў і турмаў у Польшчы, дзе музыка была сродкам катаванняў і служыла забавай для ахоўнікаў. Так, у Трэблінцы музыка гучала на ранішняй і вячэрняй паверцы, вязняў прымушалі спяваць — у тым ліку "афіцыйны" гімн лагера, напісаны на мелодыю гімна Бухенвальду (Buchenwaldlied). Пасля працы іх прымушалі слухаць "канцэрты" музыкі мірных часоў. Адзін з былых вязняў успамінае, што іх прымушалі спяваць, каб узняць настрой ахоўнікам, пакуль тыя чакалі смерці чарговай партыі зняволеных у газавай камеры. Гукі аркестра сустракалі новыя эшалоны з вязнямі. Такія ж практыкі былі і ў Сабіборы, а ў варшаўскай турме Павяк гучную радыё-музыку ўключалі, каб заглушыць крыкі падчас катаванняў (Naliwajek-Mazurek 2013: 36–44).

Не менш жудасныя сведчанні пра выкарыстанне нацыстамі музыкі і прымусовага спявання падчас расстрэлаў габрэяў у Беларусі (пад Ракавам і Слонімам) і ва Украіне прыводзіць Alexandra Birch (2021). Пры аналізе гэтых злачынстваў яна ўжывае тэрмін азбройванне (weaponization) голасу — у момант гвалту голас

"трансфармуецца ў інструмент падаўлення", становіцца зброяй, накіраванай супраць самой асобы.

У адрозненне ад шматлікіх звестак пра нацысцкія канцлагеры, менш вядома пра выкарыстанне музыкі як інструменту гвалту ў СССР. Некаторыя сведчанні пра гукавы ландшафт савецкіх турмаў і лагераў можна знайсці ў мемуарах вязняў Гулагу, напрыклад, у Анатоля Марчанкі (1969) ці Сяргея Грахоўскага (2008), і ў працах гісторыкаў — Anne Applebaum (2010) і Inna Klause. Klause (2013a) піша, што ў сістэме савецкіх лагераў музыка была адным з кампанентаў катаванняў, а таксама працэсу "перавыхавання" вязняў. Да радыё, якое транслявала ўнутрылагерныя і агульнадзяржаўныя праграмы, было амбівалентнае стаўленне: адны вязні параўноўвалі радыё з катаваннямі, іншых рэдкія хвіліны музычнай прыгажосці натхнялі і дапамагалі даць рады змрочнай паўсядзённасці (Klause 2013b).

Адно з самых ранніх сведчанняў пра прымус спяваць у савецкіх прасторах няволі — ліст у "Палітычны Чырвоны Крыж" ад Е. Філіпчанкі, якога ў 1921 годзе трымалі ў лагеры ў Халмагорах. Паверка там заканчвалася спяваннем "Інтэрнацыяналу", які не толькі выконваў функцыю гімна РСФСР (потым СССР), але быў і гімнам зняволеных эсэраў, таму ягонае прымусовае выкананне было для іх зневажальным (Klause 2013a).

Даследаванне сучасных расійскіх практык не ўваходзіць у задачы артыкула, але ў справаздачах праваабаронцаў, што я бачыў, ідзецца пераважна пра жорсткі фізічны гвалт. Можна дапусціць, што ў расійскіх "сілавых структур", як і ў савецкіх, няма патрэбы выкарыстоўваць гукавы гвалт там, дзе можна абысціся фізічным[4]. Пра музыку як "перспектыўны метад допытаў" пішуць у навуковых артыкулах студэнты-юрысты і супрацоўнікі МУС РФ, але тэксты, што ёсць у адкрытым доступе, прадстаўляюць сабой бясконцы "copy-paste", здабыць з іх канкрэтныя звесткі немагчыма.

На заканчэнне хачу адзначыць інтэрв'ю з экспертам ААН у справе катаванняў Манфрэдам Новакам (Grant & Nowak 2013). Па ягоных словах, ён з камандай маглі аператыўна рэагаваць на звесткі пра катаванні ў той ці іншай краіне, хутка атрымліваць доступ да месцаў зняволення, вязняў і дакументацыі. Сёння цяжка ўявіць, каб прадстаўнікоў ААН дапусцілі ў беларускія турмы, дазволілі атрымаць звесткі ад пацярпелых і адміністрацый. Механізм інфармавання пра катаванні, апісаны Новакам ("родныя

4 Сцэны музычных катаванняў можна знайсці ў сучасным кіно пра сталінскія рэпрэсіі. У фільме "Капітан Валканогаў збег" ёсць эпізод, дзе чэкіста катуюць калегі, надзеўшы на яго супрацьгаз і прымушаючы спяваць: Меркулова, Н., Чупов А. (2021) "Капитан Волконогов бежал [Kapitan Volkonogov bezhal]" [Film]: https://imdb.com/title/tt13322726/.

зняволенага заяўляюць праваабаронцам, а тыя паведамляюць у міжнародныя структуры") фактычна не працуе. Беларускія праваабарончыя НДА ліквідавалі ці прызналі экстрэмісцкімі фармаваннямі. Яны па-ранейшаму збіраюць магчымыя звесткі, але інфармацыя часта не можа выйсці па-за межы месцаў зняволення, бо кантакты вязняў з роднымі і адвакатамі абмежаваныя. Да таго ж, часта родныя баяцца перадаваць інфармацыю НДА, каб вязняў не пакаралі яшчэ больш жорстка, а іх не абвінавацілі ў садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці.

Таму амаль усё, што вядома пра гукавы гвалт у беларускіх месцах зняволення, мы ведаем ад людзей, якіх ужо вызвалілі. Далей я прааналізую прыклады, інфармацыя пра якія даступная з адкрытых крыніц.

## Метадалогія аналізу

Матэрыяламі для аналізу маштабаў і спецыфікі прымянення гукавога гвалту ў Беларусі сталі артыкулы ў недзяржаўных медыя і справаздачы праваабарончых ініцыятыў, што выйшлі ў 2020–2023 гг. Для якаснага аналізу гэтых тэкстаў я сабраў больш за 100 фрагментаў артыкулаў і дакументаў са сведчаннямі пацярпелых[5]. Кожнаму фрагменту я прысвоіў коды (тэгі): дэдуктыўныя коды выбраў пры вывучэнні літаратуры па тэме і першасным аналізе, індуктыўныя коды з'явіліся падчас паглыбленага аналізу і параўнання кейсаў. На аснове кодаў я сфармаваў больш агульныя катэгорыі і згрупаваў падобныя кейсы, пасля чаго выявіў сувязі паміж катэгорыямі і кодамі і адлюстраваў "кантынуум гукавога гвалту" на дыяграме, што паказвае тыпалогію сітуацый, месцаў і спосабаў прымянення гукавога гвалту.

Выбарка матэрыялаў пра гукавы гвалт у месцах зняволення мае больш за 90 крыніц[6]. Больш за ўсё публікацый узятыя з "Нашай Нівы" (21), "Зеркала\TUT.BY" (14), з сайтаў "Радыё Свабода" (10) і "Новага Часу" (8). У базу таксама трапілі артыкулы выданняў "Салідарнасць", "Вечерний Бобруйск", сайта Беларускай асацыяцыі журналістаў і інш. Сярод праваабарончых ініцыятыў былі: "Вясна" і "Гомельская вясна", Mayday Team, August2020.info, 23–34.net, "Прававая Ініцыятыва", Міжнародны камітэт даследавання катаванняў у Беларусі.

5 Я працягваю збіраць такія публікацыі, але гэты аналіз зроблены на выбарцы, сфармаванай у верасні 2023. Праз абмежаванні на аб'ём тэксту апісанне метадалогіі і вынікаў даследавання значна скарочанае.

6 Гэта ня ўсе матэрыялы па тэме, што выйшлі з 2020, але выбарка дае дастаткова дэталёвую карціну.

Для аналізу ўжывання гукавой зброі (светлашумавых гранат і вайсковага гукавога абсталявання), а таксама больш "мяккіх" практык гукавога гвалту — трансляцый прапагандысцкага кантэнту (музыкі і палітычных прамоў), я абапіраўся і на свае назіранні і аўдыязапісы, зробленыя ў 2019–2023 гг. Аналізуючы практыкі паказнога слухання, "патрыятычнага выхавання" і прапагандысцкі дыскурс, я карыстаўся матэрыяламі дзяржаўных СМІ.

## Героі публікацый

Большасць прааналізаваных інтэрв'ю далі "публічныя" людзі — журналісты, блогеры, музыкі, акцёры, палітычныя актывісты, удзельнікі каманд кандыдатаў у прэзідэнты. Іх сведчанні звычайна публікуюць пад рэальнымі імёнамі. Меншая частка людзей папрасіла захаваць ананімнасць. Інтэрв'ю рэдка ўтрымліваюць журналісцкія пытанні, таму невядома, ці людзі расказвалі пра гукавы гвалт таму, што самі лічылі гэта важным, ці таму, што інтэрв'юеры пра гэта спыталі. Імаверна, журналісты і рэспандэнты ведалі пра катаванні гукам у іншых краінах (напрыклад, з медыя і кіно), але журналісты і былыя вязні не ўжываюць у тэкстах акадэмічных тэрмінаў (акустычны, гукавы гвалт), то-бок, наўрад ці інтэрв'юеры навязвалі інфармантам пэўную канцэптуальную рамку. Такія выразы, як "катаванне гучным радыё", хутчэй за ўсё ўзнікалі ў размове спантанна, не з падачы інтэрв'юераў. Але відавочна, што рэдактары звяртаюць увагу на такія падрабязнасці — часам менавіта згадкі пра катаванні радыё ці прымус спяваць гімн траплялі ў загалоўкі артыкулаў. Справаздачы праваабарончых ініцыятыў арганізаваныя інакш, чым артыкулы ў папулярных медыя, і часцей утрымліваюць аповеды "непублічных" асоб.

## Геаграфія гукавога гвалту

Сабраныя сведчанні датычацца падзей 2020–2023 гг.[7], што адбываліся па ўсёй Беларусі ў розных тыпах прастор зняволення і паміж імі. У Мінску гэта былі цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў і ізалятар часовага ўтрымання на завулку Акрэсціна ("звычайныя" камеры і карцары), СІЗА №1 на вул. Валадарскага і СІЗА КДБ, ІЧУ Мінскага раёна на вул. Скарыны, КДБ Мінска, ГУБАЗіК, раённыя аддзелы ўнутраных спраў Мінска. У Мінскай вобласці гэта была, найперш, турма № 8 у Жодзіна, а таксама ІЧУ Маладзечна і Слуцка,

7 Адзінкавыя публікацыі, што выйшлі да 2020 г., таксама згадваюць пра гучнае радыё ў камерах.

ПУАТ-39 у Крупках. У Брэсцкай вобласці: СІЗА № 6 Баранавічаў, ПК-22 у Івацэвічах ("Воўчыя норы"), УБОП ці РАУС у Іванаве, Пінскі ІЧУ. У Віцебскай вобласці: СІЗА-2 у Віцебску, ПК-3 (ШІЗА) у пасёлку Віцьба, ПК-1 у Наваполацку. У Магілёўскай вобласці: турма № 4 і ПК-15 у Магілёве, Ленінскі РАУС, ІЧУ Магілёва, ГУБАЗіК, ПК-2 і Ленінскі РАУС у Бабруйску, ПК-17 у Шклове. Гукавы гвалт прымянялі ў міліцэйскім транспарце ("аўтазаках") па дарозе ад месцаў затрымання ў РАУС ы, у ізалятары і г. д. Мне не трапіліся звесткі пра канкрэтныя месцы прымянення гукавога гвалту ў Гомельскай і Гродзенскай абласцях.

## Формы гукавога гвалту

Аналіз сабраных звестак паказвае, што агенты дзяржавы на розных узроўнях мэтанакіравана выкарыстоўваюць практыкі, якія можна класіфікаваць як гукавы гвалт. Самыя мяккія з іх — трансляцыі "патрыятычнай" музыкі і прапагандысцкага кантэнту ў грамадскай прасторы. Практыка публічнага "паказнога" слухання, найперш прамоў Аляксандра Лукашэнкі, становіцца ўсё больш папулярнай, медыйна-заўважнай і ахоплівае працоўныя калектывы, вайскоўцаў, студэнтаў і школьнікаў. Падчас актыўнай фазы пратэстаў жніўня-лістапада 2020 года "сілавікі" ўжывалі "нелетальную" гукавую зброю — светлашумавыя гранаты, а таксама вайсковыя "гукавяшчальныя станцыі" ЗС-82.

У розных месцах зняволення "сілавікі" шырока практыкуюць прымусовую вакалізацыю — прымус да прызнанняў і запіс "пакаянняў" (зачытванне ці паўтарэнне за міліцыянтамі гатовага тэксту), прымусовае спяванне (часцей за ўсё дзяржаўнага гімна) і нават чытанне вершаў (Вясна 2023). Гэта адбываецца як пад пагрозай збівання і катаванняў, так і ў працэсе збівання. Паводле сведак, аўдыя- і відэазапісаў, гукавы ландшафт аўтазакаў (TUT.BY 2020), аддзелаў міліцыі[8], двароў ізалятараў (Новая Газета 2020), турэмных калідораў і камер быў напоўнены гукамі збівання, лаянкі, крыкаў і стогнаў, грукатам дубінак і пстрычкамі электрашокераў (Вясна 2023а), якія падымалі ўзровень страху і псіхалагічных пакут: "усю ноч стаяў грукат, лямант: «Морду вниз падла!». Крыкі, стогны, удары дручкоў не перапыняліся. [...] Часам за кожным ударам чуўся стогн, часам былі проста ўдары, чалавек ужо страціў прытомнасць, а яго ўсё яшчэ білі" (Колб 2020).

Міліцыянеры забаўляліся, збіваючы людзей пад музыку: "Супрацоўнікі СІЗА ноччу выпівалі, уключалі музыку, а потым хадзілі

8 Назва відэа мае памылковыя звесткі - гэта не Акрэсціна, а двор аднаго з мінскіх РАУС (Гулагу-нет 2020).

па камерах і здзекаваліся з затрыманых — з жанчын вербальна, а з мужчын фізічна" (Сысой 2022). У жодзінскай турме, "калі прывезлі людзей пасля нядзельнай акцыі, на іх ездзілі па калідоры, чытаючы рэп" (Вясна 2020). Вязні былі вымушаныя слухаць гучнае радыё, што грала ў камерах і на калідорах. Бывала, што ў камеры адначасова гучалі два розныя каналы (Наша Ніва 2020), часам радыё грала і ўначы. Разам з начнымі праверкамі і святлом, што гарыць дзень і ноч, гэта пазбаўляе зняволеных сну.

Далей я падрабязней разбяру асноўныя формы гукавога гвалту, пачынаючы з менш траўматычных — прымусовага ці паказнога слухання "голасу дзяржавы" на волі, пасля чаго прааналізую практыкі прымусовага слухання і вакалізацыі ў зняволенні.

## Прымусовае слуханне і інтэрналізацыя "голасу дзяржавы"

Сабраныя матэрыялы паказваюць, як галасы людзей становяцца захопленымі і адчужанымі ў прасторах няволі. Тыя ж, хто яшчэ на волі, вымушана інтэрналізуюць "голас дзяржавы". Каб апісаць, як голас уплывае на настрой гістарычных перыядаў, Гумбрэхт (2020) прапануе канцэпцыю Stimmung (настрой, атмасфера). Калі трэба акрэсліць Stimmung цяперашняй палітычнай эпохі ў Беларусі, то голас Аляксандра Лукашэнкі і эмоцыі, якія ён транслюе з 1994 года, з'яўляюцца аднымі з вызначальных фактараў гэтай атмасферы. Гэта не "найлягчэйшы дотык матэрыяльнага асяроддзя да нашых цел" (Гумбрэхт 2018), а голас, што гвалтоўна навязваецца дзесяцігоддзямі.

Па меры ўмацавання рэжыму і культу асобы Лукашэнкі, ад работнікаў дзяржсектара чакалі ўсё больш выразных праяў лаяльнасці. Спачатку іх патрабавалі ад чыноўнікаў і кіраўнікоў, але паступова ў кампаніі дэманстрацыі лаяльнасці ўцягнулі цэлыя калектывы і сем'і работнікаў, якія нават у вольны час удзельнічаюць у праўладных мерапрыемствах — розных урачыстасцях, цырымоніях ускладання вянкоў, "суботніках" і іншых формах безаплатнай працы, спартакіядах, канцэртах, сходах, аўтапрабегах. У трэці чацвер кожнага месяца праводзяцца "Адзіныя дні інфармавання", уведзеныя ўказам Лукашэнкі ў 2003 годзе — гэтая практыка працягвае савецкую традыцыю " палітінфармацыі", сходаў, на якіх інфармуюць пра "актуальныя палітычныя падзеі" і іх ідэалагічна правільную інтэрпрэтацыю.

Мэта ўсіх гэтых акцый — стварыць карціну адзінага грамадства, якое працуе і бавіць вольны час разам, ва ўнісон з кіраўніком дзяржавы. Адзін са спосабаў дэманстрацыі такой еднасці — калектыўнае

публічнае слуханне і прагляд выступаў Лукашэнкі[9], што доўжацца гадзінамі (часам больш за 7!) і становяцца асновай для "метадычак" ідэолагаў (Зеркало 2022). Супрацоўнікі бюджэтнай сферы слухаюць гэтыя выступы на працоўных месцах і ў працоўны час. Салдаты атрымліваюць доступ да ідэалагічна важнай інфармацыі з дапамогай "валізкі армейскага прапагандыста" (Государственный ВПК РБ 2017; Военное обозрение 2017) ці спецыяльнага медыя-грузавіка (Минск Новости 2022).

Пра такія актыўнасці шырока паведамляюць у мясцовых, рэгіянальных і дзяржаўных СМІ, на сайтах арганізацый і ў завадскіх газетах, у сацыяльных медыя. Фота і відэа паказваюць людзей, што сядзяць у офісах, канферэнц-залах прадпрыемстваў і бібліятэках і ўважліва слухаюць, гледзячы на экраны (Гомельские Ведомости 2022). Гэтыя прасторы часта нагадваюць школьныя класы з партамі, за якімі сядзяць пары супрацоўнікаў. Некаторыя людзі на фота нават маюць паставы "дысцыплінаваных вучняў", якія яны засвоілі ў школе. Такія выявы паказнога слухання і дэманстраванай увагі раскрываюць дысцыплінарны эфект гэтых перформансаў, дзе слухачы featureрознага ўзросту і статусу выступаюць у ролі школьнікаў, што слухаюць "голас бацькі", захоўваючы маўчанне, паслухмянасць і нерухомасць.

Калі мы разгледзім кантраляваныя сітуацыі дысцыплінаванага слухання "бацькоўскага голасу дзяржавы", то на адным полюсе ўбачым супрацоўнікаў дзяржсектара, дарослых людзей, якія патэнцыйна маюць выбар — быць пасіўнымі прыёмнікамі прапаганды, пазбегнуць удзелу, альбо ўвогуле стаць актыўнымі крытыкамі. На другім полюсе будуць школьнікі, ідэалагічны ціск на якіх пастаянна расце, у тым ліку праз прымус глядзець і слухаць выступы Лукашэнкі (KyKy.org 2022; Зеркало 2022b). Беларускі рэжым апантаны школьнай адукацыяй і "ідэалагічным выхаваннем" вучняў. Лукашэнка асабіста ўдзельнічае ў гэтых працэсах, каментуе праблемы адукацыі, патрабуе ўсё больш жорсткай дысцыпліны. Штогод ён прапануе ўсё новыя, часта супярэчлівыя, змены. Але дзяржаве мала ідэалагічнай працы ў школах — выхаванне лаяльнага грамадзяніна, на думку ідэолагаў, пачынаецца ў дзіцячых садках[10].

Пры адсутнасці цэласнай сістэмы ідэалогіі, рэжым ужывае савецкую сімволіку і лексіку, рэтранслюе цяперашнюю расійскую

9 Birdsall піша пра падобныя практыкі ў нацысцкай Германіі: "Падчас нацыянал-сацыялізму афіцыйныя радыё-трансляцыі былі непарыўна звязаныя з вобразам нямецкіх слухачоў, што ўдзельнічалі як адна з'яднаная нацыя" (Birdsall 2012: 113).

10 У лістападзе 2022 года спікерка верхняй палаты парламента Наталля Качанава заявіла, што педагогі ў павінны быць яшчэ і ідэолагамі (Зеркало 2022a).

прапаганду. Характэрны прыклад паглыблення ў бездань савецкай таталітарнай лексікі і атмасферы (Stimmung) сталінскага тэрору — ідэя аўдыяінсталяцыі ў Магілёўскім інстытуце МУС. Паводле канцэпцыі, падняўшы слухаўку рэтра-тэлефона пад бюстам Сталіна, наведвальнікі пачуюць ягоны голас: "У нас ёсць ворагі ўнутраныя. У нас ёсць ворагі знешнія. Нельга забываць пра гэта, таварышы, ні на хвіліну" (Наша Ніва 2022а).

Тых, хто спрабуе адгарадзіцца ад дзяржаўнай прапаганды, накрывае "медыя-рыкашэтам", калі апазіцыйныя СМІ публікуюць спрэчныя, абуральныя ці абсурдныя цытаты, падрабязна абмяркоўваюць выступы Лукашэнкі і іншых чыноўнікаў. Сатырычныя медыя і мемы гарантуюць, што нават тыя, хто спрабуе абараніцца ад шквалу прапаганды, даведаюцца пра ўсе апошнія "перлы" дзяржаўнай мудрасці.

"А цяпер я вам пакажу, адкуль рыхтаваўся напад на Беларусь", — гэтая фраза Лукашэнкі, сказаная ў першыя дні расейскага ўварвання ва Украіну з беларускай тэрыторыі, спарадзіла плынь відэа-мемаў. Своеасаблівая фактура голасу Лукашэнкі — хрыплы тэмбр і манера маўлення — дазваляюць спакусліва лёгка імітаваць, рабіць пародыі на яго. Нават тыя, хто ім пагарджае, часам з сарамлівым задавальненнем імітуюць голас Лукашэнкі, пераказваючы цытаты і жарты. Бум нейрасетак у 2023 дазволіў яму загучаць і на іншых мовах (акрамя беларускай) (Чык-Чырык 2023). А калі Лукашэнка хварэе, то і медыкі, і апазіцыйныя медыя абмяркоўваюць ягоны хрып і шэпт, нібы зачараваныя раптоўнай трансфармацыяй гэтага ўсюдыіснага голасу (Наша Ніва 2023).

Прааналізаваць голас Лукашэнкі і ягонае ўздзеянне на слухачоў я папрасіў трэнерку маўлення, актрысу агучкі і спявачку Марыну "Русю" Шукюраву. Яна адзначыла, што гэты голас усяляе трывогу, страх і сумненні: " Калі я слухала яго цягам гадзіны сёння, то пранікласся страхам, што «не все так однозначно», пакуль не спыніла сябе, такое вось яго таксічнае абаянне" (Шукюрава 2022). Яна дадала, што агрэсіўная, прыніжальная пазіцыя і месаджы Лукашэнкі, імаверна, найбольш уплываюць на інфантыльных людзей, што шукаюць жорсткага бацьку-аб'юзера, які сумняецца ў тваіх разумовых здольнасцях. Расійскі трэнер голасу Ілля Дзям'янаў, які аналізаваў голас Лукашэнкі, таксама лічыць, што той "прамаўляе з архетыпу бацькі, які дакарае і здзекуецца са сваіх дзяцей" (Демьянов 2020).

Мне цяжка ацаніць псіхалагічныя наступствы дзесяцігоддзяў прымусовага слухання, "пагружанасці" ў Stimmung, які штодня фармуе гэты голас, манера мыслення, маўлення і слоўнік аратара.

## Прымусовая вакалізацыя

Прымус прызнацца ў пэўных дзеяннях, зачытаць чужы тэкст, спяваць ці крычаць пад пагрозай гвалту з'яўляецца адным з найбольш разбуральных перажыванняў для ідэнтычнасці чалавека (Birch 2021). Беларускае кіно савецкіх часоў дало яскравы прыклад прымусовай вакалізацыі: у фільме "Гадзіннік спыніўся апоўначы" (1958)[11] падпольшчыцу Марыну, што працуе пакаёўкай у гаўляйтара, прымушаюць заспяваць беларускую песню дзеля забавы нацыстаў, але песня становіцца актам супраціву[12]. Даследаванні гукавога гвалту даюць многа прыкладаў прымусовай вакалізацыі, у тым ліку спявання — і гэта не толькі гісторыі з акупаваных ворагамі тэрыторый.

У Беларусі прымус спяваць дзяржаўны гімн і іншыя песні прымяняюць вельмі шырока. Пасля 2020 года гімн стаў адным з самых папулярных "выхаваўчых" сродкаў, што прымяняюць да затрыманых і зняволеных. Журналіст Аляксандр Івулін успамінае, што гімн у турме быў нават прадметам гандлю: "нехта папрасіў мыла падчас праверкі. Нам сказалі: заспявайце трэці куплет гімна і тады атрымаеце мыла. [...] Без мыла засталіся" (Жизнь-Малина 2023). Анастасію Булыбенка афіцэр прымушаў спяваць гімн, зрабіўшы гэта ўмовай вызвалення:

> "«Калі ты не ведаеш хаця б адзін радок з гімна — ты не выйдзеш." Я пачала не спяваць, а расказваць гімн. Пры гэтым ад хвалявання ўсё пераблытала — пачала ці то з другога куплета, ці то з прыпеву. Ён сказаў: «Усё зразумела, Анастасія не ведае гімн. Анастасія, назаві дзень сцяга, герба і гімна". Я ўвогуле пра такое свята не ведала і не назвала яго. Ён сказаў, што мне трэба яшчэ пасядзець і падумаць" (Кулакова 2023).

Вязняў, якіх персанал лічыць парушальнікамі парадку, змяшчаюць у штрафныя ізалятары (ШІЗА), дзе ўмовы цяжкія нават для здаровых і псіхічна ўстойлівых людзей[13]. Паводле былога вязня калоніі ў Шклове, там у ШІЗА ёсць радыёкропкі, якія ўключаюць для

11 "Песню Марыны" ў фільме "Гадзіннік спыніўся апоўначы" (1958) выканала Антаніна Кляшчова — https://youtube.com/watch?v=L_qTw4sVxQs (доступ 11.10.2023).

12 Сучасных прыкладаў акустычныга супраціву ў зняволенні многа — людзі спявалі пратэсныя і народныя песні, крычалі "жыве Беларусь!" ці "Лукашэнку ў аўтазак!", чыталі вершы, лекцыі, смяяліся. Максімум такога акустычнага супраціву адбываўся, імаверна, летам-восенню 2020.

13 У 2021 годзе ў Шклоўскай калоніі ў такой камеры пасля знясілення, недасыпання і, магчыма, збіцця, памёр палітвязень Вітольд Ашурак.

трансляцыі гімна і правілаў калоніі, сярод якіх ёсць і такое тлумачэнне: "Знаходжанне ў ШІЗА павінна прынесці асуджанаму пэўны ўзровень і комплекс псіхалагічна-маральных пакут для змены яго паводзін у бок законапаслухмянасці". Ад вязняў патрабуюць рабіць ранішнюю зарадку пад каманды з радыёкропак і спяваць гімн: "раніцай і ўвечары трэба станавіцца перад дзвярыма і спяваць гімн. На дзвярах ёсць фармуляр тэксту" (Motolko Help 2022).

Спяванне і слуханне гімна набыло асаблівае значэнне і на волі — асабліва з 2022 года. Ігнараванне гімна можа прывесці да адміністрацыйнай адказнасці і штрафу за знявагу дзяржаўнага сімвала[14]. У 2022—2023 гг. некалькіх чалавек асудзілі за тое, што яны не ўсталі падчас выканання гімна на стадыёнах (MAYDAY.TEAM 2022; Беларускі фонд спартыўнай салідарнасці 2023) і на школьным выпускным вечары (Вайтовіч 2023). За выкананнем гімна пільна сочаць у школах, дзе ён гучыць у пачатку і канцы чвэрцяў і на іншых урачыстасцях. Нават незадаволеныя такой практыкай настаўнікі тлумачаць вучням, што, "калі яны хочуць спакойна вучыцца — трэба спяваць гімн" (Зеркало 2023a), альбо не стаяць у першых шэрагах, дзе маўчанне ці няўпэўненае спяванне заўважыць адміністрацыя. Галоўны ідэолаг Міністэрства абароны Леанід Касінскі заявіў, што хацеў бы, каб гімн часцей выконвалі і ў дзіцячых садках (Зеркало 2022c)[15].

Прымусовае спяванне гімна стала папулярнай тэхнікай прыніжэння затрыманых, часткай гвалтоўнага рытуалу "канверсіі", калі асобу прымушаюць адрачыся ад "няправільных" поглядаў. Telegram і YouTube-каналы "сілавікоў" і дзяржаўных СМІ поўныя так званых "прызнавальных" ці "пакаяльных відэа"[16]. Да 2020 года такія відэа асацыявалі з рэжымам Кадырава, але потым яны сталі папулярнай формай медыя-тэрору ў Беларусі. На гэтых відэа затрыманыя выглядаюць разгубленымі, напалоханымі, некаторыя маюць сляды збівання. Тыя, хто выйшаў на волю, распавядаюць, што іх прымушалі чытаць падрыхтаваны тэкст — прызнацца ў "супрацьпраўных дзеяннях" і злачынствах, якіх яны не рабілі, пакаяцца ў намерах, якіх не мелі. Многіх пры гэтым збівалі, катавалі электрашокерамі, надзявалі на галаву пластыкавыя пакеты і г. д.

Вось тыповы змест такіх відэа: "затрыманы, следуючы камандам чалавека за кадрам, зняў з галавы кепку з «Пагоняй», кінуў

14 Статус гімна як аднаго з дзяржаўных сімвалаў зафіксаваны ў Артыкуле 19 Канстытуцыі Беларусі і ў Законе аб Дзяржаўных Сімвалах (https://pravo.by/document/?guid=3871&p2=2/1050).

15 Пакуль што гімн патрабуюць толькі слухаць (Зеркало 2023).

16 "Нашай Ніва" заклікае не называць такія відэа "пакаяльнымі" ці "прызнальнымі", бо іх запісваюць пад прымусам і мантуюць так, каб маніпуляваць выказваннямі затрыманых (Наша Ніва 2022; Вясна 2022).

яе на падлогу і стаў таптаць, напяваючы песню расійскага гурта «Любэ» пра операў” (Зеркало 2022d). Такія “рытуалы адрачэння” ўключаюць апаганьванне бела-чырвона-белага сцяга, клятвы звесці татуіроўкі з гербам “Пагоня”, фота- і відэаздымкі на фоне афіцыйнага сцяга. Прымушаючы затрыманых спяваць гімн альбо крычаць “слава Лукашэнку!” і “слава АМАПу”, супрацоўнікі МУС не толькі падпарадкоўваюць затрыманых, але і адчужаюць іх ад уласных галасоў. У 2020 такую форму прымусовай вакалізацыі вельмі часта прымянялі адразу пасля затрымання пратэстоўцаў. Па дарозе — у аўтазаках і мінібусах — і на падворках аддзелаў міліцыі і ізалятараў амапаўцы, супрацоўнікі РАУСаў і персанал ІЧУ патрабавалі ад затрыманых прызнацца, “колькі ім заплацілі” за ўдзел у пратэстах, прымушалі спяваць гімн і жорсткім збіццём каралі за “кепскае выкананне”:

“Калі дрэнна спявалі, не ведалі слоў, блыталі іх, як я (памятаю толькі савецкі варыянт гімна), ці рабілі гэта не вельмі заўзята, за гэта прылятала дубінкай. Побач ляжаў бізнесмен з Расіі, ён увогуле ня ведаў наш гімн, за што таксама моцна атрымаў [...]. Часам амапаўцаў змянялі мясцовыя міліцыянеры і рабілі паслабленні. «Ну, мы ж не фашысты» [...]. Потым вярталіся амапаўцы ў чорным, і паслабленні заканчваліся. Мы павінны былі крычаць «Здравия желаю, товарищ начальник», «Люблю ОМОН» і спяваць гімн” (Август 2020).

Гімн прымушаюць спяваць і тых, хто выказвае падтрымку Украіне. У 2023 Ларысу Несцярук затрымалі за тое, што яна падпявала песні “Україна понад усе!”. Яе прымусілі зняцца ў “пакаяльным” відэа, пахваліць уладу і праспяваць гімн (Зеркало 2023b). Брата беларускага добраахвотніка, які загінуў ва Украіне, міліцыянты затрымалі, выпадкова пачуўшы ягоны рынгтон — украінскую песню. Яго адвезлі ў ГУБАЗіК у Мінску, дзе збілі ў кабінеце з расійскімі сцягамі на сценах і прымусілі даць прызнанні на камеру: “Па дарозе ў пастарунак прымушалі спяваць гімн дзяржаўны, а я яго не ведаю [...]. Для іх чырвоныя анучы — абраза Лукашэнкі, няведанне гімна і патрыятычныя татуіроўкі. Потым сказалі: “Мы паліцыя, а вось перадаём цябе нармальнай міліцыі” (Наша Ніва 2022b). Фраза пра “міліцыю” і “паліцыю” вельмі паказальная. Анархіст Мікалай Дзядок на судзе засведчыў, што супрацоўнік ГУБАЗіК Іван Тарасік называў сваю арганізацыю “гестапа”: “«Цяпер паедзем у гестапа, а там ты будзеш плакаць і ненавідзець сябе»: Як я зразумеў, «гестапа» называлі паміж сабой будынак на Рэвалюцыйнай, 3” (Вясна 2021).

Многія беларусы з дзяцінства ведаюць, што такое гестапа і дапаможная паліцыя, арганізаваная нацыстамі падчас акупацыі, і асацыююць гэтыя арганізацыі са скрайняй бязлітаснасцю да партызанаў і цывільнага насельніцтва, якое падазравалі ў дапамозе супраціву. Вобразамі катаў-садыстаў поўныя фільмы і кнігі. На

ўроках беларускай літаратуры школьнікі вучылі верш Аркадзя Куляшова “Камсамольскі білет” (1943), дзе “вораг-жандар” прымушае хлопца адцурацца ад камсамольскага білета, але той маўчыць: “Цвёрда трымаўся юнак на дапросе, тоячы словы і думкі свае” (Куляшоў 1943).

Гэтыя радкі — з іранічнай інтанацыяй — можна пачуць у штодзённых сітуацыях, што датычацца маўчання і адмовы прызнацца ў чымсьці. Але сёння сюжэт пра “ворага-жандара”, што прымушае падпольшчыкаў прызнацца, адцурацца ад каштоўнасцяў, нават ад родных і блізкіх, стаў тыповым у сотнях выпадкаў прымусовай вакалізацыі ў кабінетах міліцыі, ГУБАЗіК, КДБ. Парадаксальна, але ў Беларусі, дзе свабода слова абмежаваная, ты не маеш і права маўчаць. Вытрымаць пагрозы і катаванні і захаваць маўчанне цяжка[17]. Фармальна беларускае заканадаўства мусіць кіравацца прынцыпам прэзумпцыі невінаватасці і забараняе публікацыю запісаў допытаў да таго, як віну чалавека дакажа суд. Згодна з Артыкулам 27 Канстытуцыі, “ніхто не павінен прымушацца даваць паказанні і тлумачэнні супраць самога сябе, членаў сваёй сям’і, блізкіх родных. Доказы, атрыманыя з парушэннем закона, не маюць юрыдычнай сілы” (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь 2022).

Што да самога гімна і факту, што многія не ведаюць ягоны тэкст, трэба адзначыць, што з 1991 да 2002 года ён быў “песняй без слоў”, і яго выконвалі толькі як інструментальную музыку. Гімн Беларусі мае тую ж музыку, што і гімн БССР 1955 года. Сучасны тэкст гімна ўхвалілі ў 2002 годзе, і ён з’яўляецца пераробкай тэксту часоў БССР. Напрыклад, першыя радкі:

“Мы, беларусы,з братняю Руссю
Разам шукалі к шчасцю дарог”

замянілі на:

“Мы, беларусы, мірныя людзі,
Сэрцам адданыя роднай зямлі”.

Гэтую дэкларацыю міралюбнасці анулявала “братняя” Расія, якая ў лютым 2022 года ўварвалася ва Украіну з Беларусі. Расійскія войскі таксама прымяняюць на акупаванай тэрыторыі Украіны прымусовую вакалізацыю. Сведчанні ўкраінскіх грамадзян (як вайскоўцаў, так і цывільных, падазраваных у сувязях з войскам ці падполлем), што пабывалі ў палоне расійскіх акупацыйных сіл,

17 Часам міліцыянтам усё ж не ўдаецца зняць відэа з прызнаннямі (Наша Ніва 2023a; Зеркало 2023c).

альбо рэжымаў ДНР і ЛНР, маюць нямала прыкладаў, калі зняволеных не толькі фізічна катавалі, але і прымушалі спяваць гімн Расіі ці СССР (розніца толькі ў тэксце), савецкія патрыятычныя песні, альбо расказваць рускія вершы (Human Rights Watch 2023). Гэта сведчыць пра еднасць гвалтоўных практык на тэрыторыі так званай "Саюзнай Дзяржавы" Беларусі і Расіі, у якую, з расійскага пункту гледжання, уваходзяць і акупаваныя ўкраінскія тэрыторыі.

## Амбівалентнасць цішыні і радыё

Многія былыя вязні згадваюць гучнае радыё, што грае ў месцах зняволення як адну з найбольшых пакут — і ўжываюць слова "катаванні". Гучную музыку ў зняволенні выкарыстоўваюць не асобна, а ў комплексе з ізаляцыяй, дэпрывацыяй сну, холадам, нястачай гігіенічных сродкаў, што забаронена міжнароднымі канвенцыямі, да якіх далучылася Беларусь (UN Treaty Body Database 2023).

Мікалая Статкевіча затрымалі яшчэ ў траўні 2020 года і ў снежні 2021 года прысудзілі да 14 гадоў пазбаўлення волі (Вясна без даты). Калі ён яшчэ меў магчымасць перадаваць інфармацыю на волю[18], то паведаміў, што супраць яго "ў асноўным выкарыстоўваюць гучны гук". Каб абараніцца, ён рабіў затычкі для вушэй з губкі для посуду.

"З рэпрадуктара круцяць запісы інтэрв'ю Лукашэнкі, пакаянняў зняволеных, службовыя інструкцыі. Сіла гуку такая, што нават тэлевізар на максімальнай гучнасці не чутна. Такое адбываецца толькі ў маёй камеры. Часам круцяць усю ноч, памяншаючы гучнасць, каб не перашкаджаць асуджаным у іншых камерах" (Александровская 2021). У снежні 2020 года Марына Адамовіч, жонка Статкевіча, паведаміла, што з яго здзекуюцца "дыскатэкай": "ад Раства да Новага года – «дыскатэка» з адмысловага дынаміка спецыяльна для адной камеры" (Салідарнасць 2021). Гучнае радыё прымянялі і супраць Наталлі Хершэ, якую прысудзілі да 2,5 гадоў пазбаўлення волі (Вясна без даты). У верасні 2021 года яе перавялі ў мужчынскую турму № 4 Магілёва, дзе, паводле слоў брата Наталлі, "катавалі беларускім радыё і холадам":

> "Цяпер у камеры Наталлі з 6 раніцы і да 22 гадзін, да адбою, на максімальную гучнасць уключаюць беларускае радыё. Яна ўвесь час у камеры, апроч прагулкі на гадзіну, і для яе гэтае радыё невыноснае. Наталля прасіла яго сцішыць ці выключыць, але не атрымала станоўчага адказу" (Радыё Свабода 2022).

18 На момант напісання гэтага тэксту пра Статкевіча не было інфармацыі ўжо 10 месяцаў (з лютага 2023).

У студзені 2022 года Хершэ абвясціла галадоўку, а 18 лютага яе вызвалілі, дзякуючы дыпламатычным намаганням Швейцарыі.

Пра выкарыстанне гуку падчас допытаў амаль нічога не вядома. Імаверна, людзі, супраць якіх маглі прымяняць такую тэхніку, яшчэ не хутка выйдуць на волю. Адзінае сведчанне, што пакуль удалося знайсці — расповед жанчыны, якую затрымалі за каментар у сацыяльных сетках з нагоды забойства афіцэра КДБ. Тады за такія каментары затрымалі многа людзей, і КДБ імкнуўся даказаць, што яны частка адной "ботафермы". Калі Аліса (імя зменена) ужо не магла адказваць на пытанні, ёй прыгразілі, што "будуць цягаць нас на допыты, уключаць нейкі аўдыязапіс па шэсць гадзін" (Вясна 2023d). Пазней яе трымалі ў Жодзіна, дзе некалькі разоў на ноч падымалі і дзе штодня гучна грала радыё: "Кожны дзень у турме ўключалі пасланне Лукашэнкі Усебеларускаму народнаму сходу. Гэта называлі прафілактычнымі мерапрыемствамі. Пастаянна гэтае радыё крычала" (Там жа).

У лютым 2022 за "незаконнае пікетаванне" затрымалі жыхара Вязынкі і змясцілі ў ІЧУ г. Маладзечна і прымусілі слухаць/глядзець прапаганду з прымяненнем тэхнікі "напружанай позы":

> "Тры ночы запар з 20:00 да 6:00 хлопца выводзілі ў «спецыяльны» кабінет. Там некалькі гадзін яму паказвалі відэа з выступамі Лукашэнкі, а ён павінен быў увесь час стаяць і глядзець. Пры гэтым прысутнічалі і міліцыянты, якія кантралявалі працэс. Але яны мяняліся, каб паспаць" (Вясна 2022a).

Віталь Жук быў вымушаны слухаць прамовы Лукашэнкі ў бабруйскай ПК-2:

> "Ты прачынаесься і трасесься ад холаду — і засынаеш трасучыся. [...] Яшчэ гучна ўключалі радыё. І вось я абхапіў трубу, калачуся, а па радыё Лукашэнка гаворыць: «Чаго нас Захад папікае парушэньнем правоў чалавека? Мы ніколі не парушалі правоў чалавека». Я гэта запомніў добра. Я вельмі хацеў выжыць, выйсьці і расказаць людзям, што тут робіцца насамрэч. Мне гэта нават дало сілы" (Радыё Свабода 2023).

Калі ў звычайных камерах вязні пакутавалі ад немагчымасці застацца ў цішыні, той, хто доўгі час быў у ізаляцыі, наракае на невыноснасць цішыні. Пра тое, што і радыё, і цішыня маюць амбівалентную ролю, сведчыць досвед Алега Груздзіловіча, які пабываў у ШІЗА Магілёўскай калоніі № 15, дзе не было радыё:

> "Нават радыё, якое ледзь-ледзь грае недзе ў канцы калідора, у камэры ШІЗА не працуе. Карацей, поўная ізаляцыя, якую

немагчыма не параўнаць з катаваньнем. Чалавек, якога на шмат дзён зьмяшчаюць у ШІЗА, рызыкуе тым, што проста можа звар'яцець" (Грузьдзіловіч 2023: 29).

Каб даць рады з ізаляцыяй, Груздзіловіч размаўляў сам з сабою, чытаў вершы, спяваў і танчыў, калі чуў з вуліцы радыё, што грала для вязняў, якім дазволеная прагулка:

"Калі ў дворыку гучыць музыка — у мяне дыскатэка. Танцую як шалёны, бо праз паўгадзіны музыку адключаць, і ў турме да вечара будзе амаль мёртвая цішыня. А як па мне, гэта ўзьдзейнічае на псыхіку горш за крыкі, пагрозы ці ляскат дзьвярэй, калі некага прыводзяць ці выводзяць. Карацей, у ШІЗА крытычна патрэбны нейкі рух, які дазволіць пераключыць увагу, прагнаць дрэнныя думкі" (Грузьдзіловіч 2023: 108-109).

Іншы вязень той жа калоніі, якога трымалі ў "памяшканні камернага тыпу" (ПКТ), мусіў затыкаць вушы паперай, каб абараніцца ад гучнага радыё:

"Радыё ўключаюць на ўсю моц, і ты нічога з гэтым зрабіць ня можаш. Праз паўгадзіны галава расколваецца. Таму не зайздросьць це ПКТ, там горш, чым у ШІЗА [...] Хваля адна і тая ж, бясконца круцяць тыя самыя песьні, у канцы кожнай гадзіны крыху навінаў, але лепш бы іх не давалі — усё пра Лукашэнку. За месяц ад гэтага можна звар'яцець. Колькі мы ні прасілі сьцішыць радыё, нас ня слухалі. Гэта такое катаваньне, рэальна" (Грузьдзіловіч 2023: 165-166).

Можна зрабіць выснову, што галоўны фактар тут — здольнасць чалавека кантраляваць сваё гукавое асяроддзе. Гэта адна са ступеняў свабоды, даступная, альбо недаступная чалавеку. Калі выбару няма, пакутай будзе і гучны гук, і цішыня.

Часам радыё было адзінай крыніцай навін. Адфільтраваныя і тэндэнцыйна прэзентаваныя, яны, аднак, давалі нейкае ўяўленне пра тое, што адбываецца на волі. Вобраз рэальнасці складваўся змрочны: "з навінамі адтуль здавалася, што вось ты выйдзеш, а там на волі ўжо ўсё яшчэ горш" (Наша Ніва 2021). Калі Расія напала на Украіну ў лютым 2022 года, некаторыя вязні пра гэта не ведалі яшчэ доўга:

"Пра вайну Расіі супраць Украіны я даведаўся ад свайго адваката, было гэта недзе праз тыдзень пасля яе пачатку. З таго, што чуў па радыё, разумеў, што там адбываецца нейкі канфлікт, аднак было незразумела, што там на самай справе і ў якіх маштабах" (Наша Ніва 2022c).

Іншым жа інфармацыю пра вайну падалі здзеклівым чынам:

> "24 лютага 2022 года дзяўчаты з іншых камер пайшлі на прагулку, і ім уключылі песню «Свяшчэнная вайна». Яны вельмі перапужаліся і пачалі распытваць ахоўнікаў, што адбываецца, з кім ваюем. Людзі доўга заставаліся ў няведанні, што вельмі моцна іх траўмавала" (Вясна 2023b).

## Патрыятычны плэйліст

У турмах гучаць нацыянальныя і рэгіянальныя каналы, а таксама ўнутранае радыё, праз якое перадаюць інфармацыю пра распарадак дня, правілы і інструкцыі. Самым "лагодным", паводле вязняў, было "Радыё Культура" з музычнымі і культурніцкімі праграмамі на беларускай мове, але і яно раздражняла. Адзін з былых вязняў, А., расказаў у серыі фэйсбук-допісаў[19], як спрабаваў даць рады з радыё, якіх было два — у камеры і ў дворыку. Ведаючы беларускую літаратуру і музычную класіку, ён тлумачыў сукамернікам сюжэты радыёспектакляў, каментаваў надакучлівую музыку. Увогуле, былыя вязні амаль не згадваюць "нейтральную" поп-музыку, якую чулі па турэмным радыё, затое пералічваюць песні, якія іранічна называюць "патрыятычнымі". Вось некаторыя з іх:

Сябры "Слушай Батьку"
Анжаліка Агурбаш "Белая Русь" (музыка і словы: Ігар Цімакоў)
Аляксандра Мелех "Ах, Александр!" (музыка: Яўген Алейнік, словы: Ганна Сялук)
Ангеліна Волкава "Бульба-дэнс" (музыка: Яўген Алейнік, словы: Ганна Сялук)
Бадя, Svist "Мама-Беларусь" (музыка і словы: Бадя).

Такі "патрыятычны плэйліст" можна пачуць і на волі — у грамадскіх прасторах, на дзяржаўных канцэртах і святкаваннях. Набор гэтых песень абмежаваны, таму ў турмах увесь плэйліст, што займае каля 40 хвілін, часам паўтараюць па коле. Адзін былы вязень успамінае, што ім уключалі нават песню Данчыка "Беларусь мая". Магчыма супрацоўнікі ізалятара не ведалі, што гэты спявак з беларускай дыяспары ЗША працаваў на "Радыё Свабода", і што ягоная песня — частка "патрыятычнага плэйліста" апазіцыі[20].

19 Не прыводжу спасылку ў мэтах абароны прыватнасці былога вязня.

20 Грузьдзіловіч таксама згадвае гэтую песню — ён спяваў яе, каб не звар'яцець у ШІЗА.

У турэмнай падборцы была і песня Анжалікі Агурбаш. Раней частая ўдзельніца дзяржаўных канцэртаў, заслужаная артыстка Беларусі, у 2020 годзе Агурбаш падтрымала пратэсты. Супраць яе ўзбудзілі крымінальную справу ды завочна арыштавалі, аднак песня "Белая Русь" працягвала гучаць на вуліцах і ў турмах[21]. Відавочна, дзяржава мае праблемы з фармаваннем "патрыятычнага рэпертуару", раз вымушаная ўключаць у яго песні нелаяльных спевакоў. Гэтую праблему цяпер вырашае Ганна Сялук (псеўданім адной з нявестак Аляксандра Лукашэнкі), чые песні ў выкананні розных спевакоў займаюць асноўныя месцы ў патрыятычным плэйлісце[22].

Ва ўспамінах былых вязняў я не сустрэў згадак пра вайскова-патрыятычныя песні армейскіх гуртоў. Але падчас "музычнай пацыфікацыі" пратэстаў у жніўні-верасні 2020 такі "дэсантны поп" на вуліцах Мінска транслявалі праз вайсковыя "гукавяшчальныя станцыі". Дзяржава даўно выкарыстоўвала музыку, каб заглушыць галасы апазіцыі, але не ў такіх маштабах, як у 2020 годзе. У снежні 2019 года, падчас пратэстаў супраць "інтэграцыі" Беларусі і Расіі, беларускамоўныя выступы лідараў апазіцыі глушылі гучнымі навагоднімі песнямі на рускай мове (Political Soundwalks 2020), аднак выступоўцы ўсё яшчэ маглі звяртацца да мітынгоўцаў з прамовамі. У 2020 годзе, каб стварыць акустычны і псіхалагічны ціск на дэманстрантаў, "патрыятычную" музыку транслявалі праз вулічныя дынамікі: "з мэтай стварэння станоўчага і добрага настрою ў жыхароў і гасцей сталіцы, якія выступаюць у падтрымку міру, спакою і парадку на тэрыторыі горада, Мінгарвыканкамам было прынятае рашэнне аб трансляцыі музычных кампазіцый вядомых кампазітараў" (TUT.BY 2020a).

Новым спосабам "адпудзіць" пратэстоўцаў стала выкарыстанне армейскай бронетэхнікі з моцнымі дынамікамі — дзвюх "гукавяшчальных станцый" ЗС-82 на базе савецкіх бронемашын БРДМ-2, чые калонкі магутнасцю да 1000 ват могуць трансляваць гук на дыстанцыю да 6 кіламетраў, каб весці "псіхалагічную вайну" — заклікаць праціўніка здацца і ствараць акустычную ілюзію перамяшчэння цяжкай тэхнікі там, дзе яе няма. Расійская армія выкарыстоўвае ЗС-82 і больш магутныя ЗС-88 у Сірыі (Брусилов, Моисеев 2018) і ва Украіне (TSN.UA 2022; Петров 2023). Беларускае ж войска выкарыстала іх супраць сваіх грамадзян. ЗС-82 стваралі "ахоўную" акустычную тэрыторыю вакол музея Вялікай Айчыннай вайны і плошчы Перамогі. Сімвалізм лакацый вызначыў іх плэйліст — сумесь савецкіх вайсковых песень, музыкі сучасных беларускіх і расійскіх

21 Толькі ў кастрычніку 2023 года прапагандыст Юры Увараў задаўся пытаннем, чаму песні Агурбаш гучаць у цягніках (Наша Ніва 2023b).

22 За тры гады Ганна Сялук напісала 106 песень (Гулицкий 2023).

вайсковых гуртоў, лагодны фолк-рок 1970–1980-х і "патрыятычныя" хіты праўладных спевакоў. Часам выбар кампазіцый быў дзіўны, і тэксты песень давалі вялікі прастор для інтэрпрэтацый. Напрыклад, песня расійскага выканаўцы вайскова-патрыятычных песень Уладзіміра Мазура заклікала "салдатаў удачы" адумацца:

"Снова кто-то кричит о величьи России,
А ты кровь проливаешь и видишь насилье.
Твою душу терзают большие сомненья.
Без войны не живёт ни одно поколенье" (Мазур).

А песня Сяброў "Беларусь сінявокая" (1985) нібы падбадзёрвала дэманстрантаў, што ішлі "над Свіслаччу" з лозунгамі "Гэта наш горад!":

"Мілая, паслухай голас горада,
Гукі старажытных камяніц.
Іх жыццё вялікае і гордае
Высветлена полымем байніц.
Як нам сёння хораша над Свіслаччу
Марыць пра каханне і жыццё!
Хай нам шлях далёкі будзе вызначан
Плошчаю, дзе вечнасці касцёр" (Сябры 1985).

Рэальны эфект "спяваючых танкаў", як іх называлі пратэстоўцы, быў хутчэй камічным — людзі смяяліся з песень, парачкі танчылі вальс. На шчасце, гэтае абсталяванне не выкарыстоўвалі на поўную моц — не транслявалі сфакусаваны шум ці музыку на траўма-небяспечнай гучнасці.

## Наступствы гукавога гвалту

З самымі цяжкімі наступствамі сутыкнуліся людзі, што пацярпелі ад выбухаў светлашумавых гранат — гукавой зброі "нелетальнага" дзеяння, якую "сілавікі" прымянялі з блізкай дыстанцыі, вынікам чаго сталі цяжкія траўмы, разрывы барабанных перапонак, апёкі і раны ад аскепкаў[23]. Павел Сібілеў, кіроўца аўтобуса, які не ўдзельнічаў у пратэстах, атрымаў цяжкае раненне светлашумавой гранатай і гумавымі кулямі 10 жніўня 2020 года і памёр у кастрычніку 2021 года (Наша Ніва 2021а).

23 Гл.напрыклад запісы праекта "Август 2020" пад тэгам #светошумоваяграната: https://august2020.info/ru/search?tag=granata (доступ 05.10.2023).

Людзі, што сутыкнуліся з гучнай радыё-музыкай у камерах, адзначалі немагчымасць сканцэнтравацца, парушэнне сну, галаўны боль. Прымусовую вакалізацыю яны ўспрымалі менавіта як гвалт. Прымус спяваць гімн, як умова вызвалення з турмы, выклікаў кашмары ў Анастасіі Булыбенка: "«Цэрбер» стаў маім новым пераследнікам. На сутках мне снілася, як я спяваю яму гімн, ужо тут, у Вільнюсе, як ён разразае мне твар" (Кулакова 2023). Дана Чвялева, якую прымусілі чытаць тэкст самаагавору, кажа, што пра гэты досвед цяжка забыцца: "Было прыкра, і па маім твары на тым відэа ўсё ж відаць, што гавару не сваімі словамі, а пад прымусам. Дагэтуль засталося адчуваньне нейкага маральнага гвалту, і яно ніколі ня зьнікне" (Радыё Свабода 2023a). Журналістка выдання, якое закрыла дзяржава, расказвае, што пасля зняволення калегі востра рэагавалі на стук, гучны гук і на пэўную музыку: "Зайшлі ў супермаркет, там прайгравалася нейкая англамоўная песня. Калега аж збялеў і выбег з залы на вуліцу. Аказалася, што ўсе 15 сутак, якія ён адбываў «за супрацiў», з раніцы да ночы круцілі менавіта гэтую песню" (Беларуская Асацыяцыя Журналістаў 2023).

Такія рэакцыі могуць сведчыць пра посттраўматычны стрэсавы разлад (ПТСР) — псіхічны стан, які патрабуе прафесійнай медыцынскай дапамогі. Chornik (2018) адзначае, што пакуль не было клінічных даследаванняў наступстваў злоўжывання музыкай супраць зняволеных. На жаль, пра наступствы гукавога гвалту мы больш ведаем ад праваабаронцаў, музыколагаў і сацыяльных даследчыкаў. Гэта яшчэ раз падкрэслівае неабходнасць вывучаць сведчанні палітычных вязняў, якія пацярпелі ад розных форм гвалту, у тым ліку гукавога, і патрабуюць кваліфікаванай дапамогі.

## Кантынуум гукавога гвалту

Аналіз эмпірычных матэрыялаў і літаратуры дазваляе выявіць тыповыя практыкі гукавога гвалту, ацаніць ягоныя маштабы і сістэмнасць, картаграфаваць ягоны кантынуум. Траўматычныя практыкі і досвед, выкліканыя імі, можна класіфікаваць паводле таго, у якой прасторы яны адбываюцца, ці існуе магчымасць пазбегнуць гвалтоўнага гукавога ўздзеяння і наколькі вялікую і незваротную шкоду чыніць гукавое ўздзеянне і спадарожны фізічны гвалт. Я выбраў гэтыя тры вымярэнні — умоўна іх можна назваць восямі "прасторы", "свабоды" і "шкоды" — і простую шкалу значэнняў ад 0 да 3, дзе 0 — мінімальнае значэнне параметра, 3 — максімальнае. Паводле

гэтай шкалы я ацаніў сучасныя і гістарычныя формы гукавога гвалту ў Беларусі[24].

Месцамі гукавога ўздзеяння могуць быць публічныя прасторы рознага маштабу (вуліцы і плошчы, канцэртныя залі, стадыёны, кінатэатры, навучальныя ўстановы — двары, будынкі, класы), будынкі прадпрыемстваў і ўстаноў, міліцэйскі транспарт, аддзелы міліцыі і іншых "сілавых" структур, прасторы зняволення рознага тыпу і рэжыму. Дыяпазон магчымасцяў пазбегнуць гукавога гвалту мае два полюсы — ад поўнай свабоды пакінуць месца непажаданага гукавога ўздзеяння, да немагчымасці не проста абараніцца ад гуку, а ўвогуле рухацца. Дыяпазон шкоды вар'іруецца ад нулявой шкоды да дыскамфорту, непасрэднай шкоды для здароўя (фізічнага ці ментальнага), калецтва і смерці.




Мал. 1. Кантынуум гукавога гвалту

Сітуацыі і досвед гукавога гвалту, які адбываецца цяпер ці адбываўся раней на тэрыторыі Беларусі, можна адлюстраваць на

24 Гэта не адзіны магчымы спосаб апісаць такі кантынуум. Можна выбраць вымярэнні, якія б адлюстроўвалі ступень уключанасці чалавека, на якога ўздзейнічае гук, і паказвалі, ці магчыма ігнараваць гукавое ўздзеянне, альбо трэба слухаць з пэўнай ступенню ўважлівасці, і ці мусіць чалавек пры гэтым толькі маўчаць, альбо можа — ці нават павінен — выказвацца, вакалізаваць.

графіку (гл. Малюнак 1). Палюсамі тут будуць, з аднаго боку, "патрыятычная" музыка і прапаганда ў гарадской прасторы ў сучаснай Беларусі, з другога боку — прымус спяваць падчас масавых расстрэлаў цягам Другой сусветнай вайны. Такая мадэль дазваляе візуалізаваць не толькі рэальны на сёння дыяпазон гукавога гвалту, але і патэнцыйны. Яе можна прымяніць не толькі да беларускай сітуацыі, а прааналізаваць з яе дапамогай практыкі і досвед гукавога гвалту ў іншых краінах і гістарычных перыядах.

## Заключэнне

Пачынаючыся з адносна менш шкодных трансляцый "патрыятычнай" музыкі і слухання прапагандысцкіх прамоў "на волі", гукавы гвалт нарастае ў прасторах зняволення, адкуль з цяжкасцю даходзіць інфармацыя і куды не трапляюць праваабаронцы і прадстаўнікі міжнародных арганізацый. Таму мы можам вывучаць беларускія практыкі гукавога гвалту на падставе звестак ад былых вязняў. Паводле іх сведчанняў, гукавы гвалт з'яўляецца часткай рэпрэсіўнага інструментарыю разам з іншымі тэхнікамі жорсткага абыходжання, псіхалагічнага і фізічнага гвалту.

Праведзены аналіз дазваляе скласці тыпалогію форм і сітуацый гукавога гвалту і картаграфаваць іх, каб паказаць, як яны адрозніваюцца паводле характару, інтэнсіўнасці, працягласці і нанесенай шкоды. Гэта дае магчымасць параўнаць лакальныя рэпрэсіўныя практыкі з іншымі прыкладамі з мінулага і сучаснасці і паказвае, што існуе гістарычны і геаграфічны паралелізм паміж практыкамі гукавога гвалту ў Беларусі і за мяжой. Градацыі паміж гэтымі практыкамі часта няўлоўныя і складаюць непарыўны кантынуум палітычна-матываванага гукавога гвалту. Ягоныя наступствы могуць быць працяглымі і цяжкімі — найчасцей гэта сімптомы, характэрныя для ПТСР, але выкарыстанне светлашумавых гранат прыводзіла да парушэння слыху, калецтваў і нават смерці.

У сведчаннях беларусаў, што толькі нядаўна выйшлі на волю, мы чуем — часам амаль слова ў слова — тое ж, што чулі ад былых вязняў даследчыкі і суддзі на трыбуналах над іншымі злачыннымі рэжымамі. На шчасце, сёння ў Беларусі мы не назіраем крайняй формы гукавога гвалту — выкарыстання музыкі і прымусовай вакалізацыі пры расстрэлах, што рабілі нямецкія акупанты падчас Другой сусветнай вайны. Але бачна, наколькі блізка да гэтай мяжы падышлі беларускія "праваахоўнікі". Гвалтоўныя практыкі беларускага рэжыму займаюць небяспечную зону. Бескантрольнае і беспакаранае ўжыванне розных гвалтоўных тэхнік і атмасфера беззаконня, санкцыянаваная Аляксандрам Лукашэнкам і найвышэйшымі чынамі "сілавых" службаў, ужо прывялі да гібелі

людзей на вуліцах і ў турмах — і ствараюць умовы для пашырэння маштабаў і эскалацыі гвалту.

Гэтае папярэдняе даследаванне патрабуе працягу, збору і аналізу большага аб'ёму разнастайных эмпірычных матэрыялаў — не толькі медыйных публікацый і справаздач праваабарончых ініцыятыў, але і інтэрв'ю са сведкамі, што перажылі гвалт. Таксама варта больш дэталёва прааналізаваць звесткі пра ўжыванне гукавога гвалту ў СССР/БССР і Беларусі перыяду 1990—2020 гг. Сярод аспектаў, якія трэба даследаваць, галоўным, на маю думку, з'яўляецца вывучэнне наступстваў гукавога гвалту — і спосабаў ацалення ад яго. Таксама важнае пытанне, ці гвалтоўныя гукавыя тэхнікі, што практыкуюць розныя агенты дзяржавы, заснаваныя на іх інтуітыўным разуменні эфектаў гукавога гвалту, "няяўных" (tacit) практычных ведах, што перадаюцца ад старэйшых калег да малодшых — альбо гэта дэталёва распрацаваны падыход, што грунтуецца на пэўных тэорыях і ўнутраных інструкцыях.

## References


Applebaum, A. (2010). *Gulag: a History*. Anchor eBooks.

Birdsall, C. (2012). *Nazi Soundscapes: Sound, Technology and Urban Space in Germany*, 1933–1945. Amsterdam University Press. http://jstor.org/stable/j.ctt46mv5n.

Birch, A. (2021). "They were drinking, singing, and shooting": Singing and the Holocaust in the USSR. *Journal of Perpetrator Research*, vol. 4, no. 1, 2021: 171–191. https://jpr.winchesteruniversitypress.org/articles/abstract/10.21039/85/.

Chornik, K. (2013). Music and Torture in Chilean Detention Centers: Conversations with an Ex-Agent of Pinochet's Secret Police. *The World of Music*, 2(1): 51–65. http://jstor.org/stable/24318196.

Chornik, K. (2018). Memories of Music in Political Detention in Chile Under Pinochet. *Journal of Latin American Cultural Studies*, 27:2: 157–173. DOI: https://doi.org/10.1080/13569325.2018.1450742.

Cusick, S. (2008). "You are in a place that is out of the world…": Music in the Detention Camps of the "Global War on Terror". *Journal of the Society for American Music*, 2(1): 1–26. https://doi.org/10.1017/S1752196308080012.

Duarte, A (2015). Acousmatic and Acoustic Violence and Torture in the Estado Novo: The Notorious Revelations of the PIDE/DGS Trial in 1957. *Music & Politics*, Volume IX, Issue 1. https://doi.org/10.3998/mp.9460447.0009.101.

Grant, M. J. (2020). Pathways to music torture. *Transposition* [Online], 4. http://journals.openedition.org/transposition/494.

Grant, M. J. & Nowak, M. (2013). "Human Rights Have Made a Difference": An Interview with Manfred Nowak. *The World of Music*, 2(1): 91–98. http://jstor.org/stable/24318198.

Gumbrecht, H. U. (2020). After 1945: Latency as Origin of the Present. Stanford University Press. https://doi.org/10.1515/9780804786164.

Gumbrecht, H. U. (2018). Schto robitz muzyku nepereadolnaj? / Svaboda holasu Djenis Ljoplin. *Topos*, №1: 119-127. http://journals.ehu.lt/index.php/topos/article/view/138. — In Bel.

[Гумбрэхт, Г. (2018). Што робіць музыку неперaадольнай? / Свабода голасу Джэніс Джоплін. *Topos*, №1: 119-127. http://journals.ehu.lt/index.php/topos/article/view/138.]

Hennessy, M. (2014). British ministers sanctioned torture of NI internees. *The Irish Times*, June 5. https://irishtimes.com/news/politics/british-ministers-sanctioned-torture-of-ni-internees-1.1820882 (доступ 08.10.2023).

Hrakhowski, S. (2008). *Zona mawchannya*. Minsk: Mastatskaya litaratura. — In Bel.

[Грахоўскі, С. (2008). *Зона маўчання*. Мінск: Мастацкая літаратура.]

Hruździlovich, A. (2023). *Mae turemnyja mury*. Radio Svabodnaja Europa/Radio Svabona. https://docs.rferl.org/be-BY/2023/07/27/01000000-0a00-0242-5121-08db8e97f153.pdf. — In Bel.

[Грузьдзіловіч, А. (2023). *Мае турэмныя муры*. Бібліятэка Свабоды. XXI ст. Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода. https://docs.rferl.org/be-BY/2023/07/27/01000000-0a00-0242-5121-08db8e97f153.pdf.]

Klause I. (2013a). Music and "Re-education" in the Soviet Gulag. *Torture: quarterly journal on rehabilitation of torture victims and prevention of torture*, 23 (2): 24–33.

Klause I. (2013b). Music in Radio Broadcasts in the Gulag. *In*: Grant M. J., Stone-Davis F. J. (eds) *The Soundtrack of Conflict: The Role of Music in Radio Broadcasting in Wartime and in Conflict Situations*. Hildesheim: Olms Verlag, 13–23.

Kulyashow, A. (1943). Kamsamol'ski bilyet. https://knihi.com/Arkadz_Kulasou/Kamsamolski_bilet.html (доступ 11.10.2023). — In Bel.

[Куляшоў, А. (1943). Камсамольскі білет, невядомае выданне. https://knihi.com/Arkadz_Kulasou/Kamsamolski_bilet.html (доступ 11.10.2023)].

Marchenko A. (1969). *Moi pokazaniya*. Paris: La Presse Libre. — In Russ.

[Марченко, А. (1969). *Мои показания*. Paris: La Presse Libre.]

Naliwajek-Mazurek, K. (2013). Music and Torture in Nazi Sites of Persecution and Genocide in Occupied Poland, 1939–1945. The World of Music, 2 (1): 31–50. http://jstor.org/stable/24318195.

Office of the United Nations High Commissioner for Human Rights (2022). Istanbul Protocol. Manual on the Effective Investigation and Documentation of Torture and Other Cruel, Inhuman or Degrading Treatment or Punishment. Professional Training Series No. 8/Rev. 2, New York and Geneva. https://ohchr.org/sites/default/files/documents/publications/2022-06-29/Istanbul-Protocol_Rev2_EN.pdf (доступ 10.10.2023).

Papaeti, A. (2013a). Music and "Re-education" in Greek prison camps: from Makronisos (1947–1955) to Giaros (1967–1968). *Torture: quarterly journal on rehabilitation of torture victims and prevention of torture*, 23 (2): 34–40. https://pubmed.ncbi.nlm.nih.gov/24480891/.

Papaeti, A. (2013b). Music, Torture, Testimony: Reopening the Case of the Greek Junta (1967–1974). *The World of Music*, 2 (1): 67–89. http://jstor.org/stable/24318197.

Piore, A. (2003). Periscope: PSYOPS: Cruel and Unusual. *Newsweek*, 18 May. https://newsweek.com/periscope-137213 (доступ 07.10.2023).

UN General Assembly (1984). Convention Against Torture and Other Cruel. Inhuman or Degrading Treatment or Punishment, 10 December. *United*

*Nations*, *Treaty Series*, vol. 1465. https://refworld.org/docid/3ae6b3a94.html (доступ 10.10.2023).
UN Treaty Body Database (2023). Ratification Status for Belarus. https://tbinternet.ohchr.org/_layouts/15/TreatyBodyExternal/Treaty.aspx?CountryID=16&Lang=en (доступ 14.10.2023).

## Other sources:

Human Rights Watch (2023). Ukraine: Russian Torture Center in Kherson Unlawful Detention. Torture of Civilians During 8-Month Occupation, 13 April. https://hrw.org/news/2023/04/13/ukraine-russian-torture-center-kherson (доступ 21.12.2023).
MAYDAY.TEAM (2022). Футбольному болельщику дали штраф за то, что он не встал во время гимна, 26 августа. https://t.me/MAYDAYMog/2756 (доступ 11.10.2023).
Motolko Help (2022). "По его приказу осуществляются насильственные действия над осужденными": Бывший узник шкловской колонии рассказал, кто может быть причастен к гибели Витольда Ашурка, 16 декабря. https://motolko.help/by-articles/pa-yagonym-zagadze-zdzyajsnyayuczcza-gvaltoynyya-dzeyanni-nad-asudzhanymi-byly-vyazen-shkloyskaj-kalonii-raspavyoy-hto-mozha-mecz-dachynenne-da-gibeli-vitolda-ashurka/ (доступ 11.10.2023).
Political Soundwalks (2020). Minsk, December 2019 / Мінск, Снежань 2019. https://soundcloud.com/political_soundwalks/sets/minsk-2019-12 (доступ 13.10.2023).
TSN.UA (2022). Рупор пропаганды на колесах: ВСУ затрофеили под Изюмом звуковещательную станцию рашистов, 15 сентября. https://tsn.ua/ru/ukrayina/rupor-propagandy-na-kolesah-vsu-zatrofeili-pod-izyumom-zvukoveschatelnuyu-stanciyu-rashistov-foto-2158252.html (доступ 13.10.2023).
TUT.BY (2020). Что происходит внутри автозака. Человек снял своё задержание на видео, 26 августа. https://youtube.com/watch?v=RrcaoCdlBvs (доступ 03.10.2023).
TUT.BY (2020a). Слышали очень громкие советские песни во время протестов? Минские власти объяснили, зачем их включают, 9 сентября, архіўная копія: https://web.archive.org/web/20200910152357/https://news.tut.by/society/699877.html (доступ 13.10.2023).

Август 2020 (без даты). Они сортировали, кому достаточно подвалили, а кого еще бить. Я ходил по этому кругу несколько раз. https://august2020.info/ru/detail-page/297 (доступ 10.10.2023).
Александровская, Б. (2021). Интервью Статкевича из тюрьмы: "Диктатор не дождется". *Deutsche Welle*, 1 апреля. https://dw.com/ru/intervju-nikolaja-statkevicha-iz-tjurmy-diktator-ne-dozhdetsja/a-57061721 (доступ 07.10.2023).
Беларуская Асацыяцыя Журналістаў (2023). "Айфоны калег ускрылі спецыяльнай прыблудай на раз-два". Аповед журналістаў, чыю рэдакцыю знішчылі два месяцы таму, 19 чэрвеня. https://baj.media/be/analytics/ayfony-kaleg-uskryli-specyyalnay-prybluday-na-raz-dva-apoved-zhurnalistau-chyyu-redakcyyu (доступ 12.10.2023).

Беларускі фонд спартыўнай салідарнасці (2023). Футбольнага заўзятара з Гродна асудзілі за тое, што ён не ўстаў пры выкананні гімна, 14 чэрвеня. https://t.me/zozhteam/3053 (доступ 11.10.2023).

Брусилов А., Моисеев. А. (2018) Редкая и очень громкая версия БТР-80 замечена в Сирии. *Российская Газета*, 12 октября. https://rg.ru/2018/10/12/redkaia-i-ochen-gromkaia-versiia-btr-80-zamechena-v-sirii.html (доступ 13.10.2023).

Вайтовіч, К. (2023). "Злоснае правапарушэнне" ў Нароўлі, Гомельская Вясна — праваабарончы сайт, 14 верасня. https://gomelspring.org/be/news/10066 (доступ 11.10.2023)

Военное обозрение (2017). Портативный информационный комплекс ПИК-2015. http://topwar.ru/119365-portativnyy-informacionnyy-kompleks-pik-2015-respublika-belarus.html (доступ 13.10.2023).

Вясна (без даты). Палітычныя вязні ў Беларусі — Мікалай Статкевіч. https://prisoners.spring96.org/be/person/mikalaj-statkievich (доступ 15.10.2023); Палітычныя вязні ў Беларусі — Наталля Хершэ. https://prisoners.spring96.org/be/person/natallja-khersze (доступ 14.10.2023).

Вясна (2020). "За детей готов к любым репрессиям": Алесь Толстыко рассказал о своих сутках, 16 лістапада. https://spring96.org/ru/news/100433 (доступ 11.10.2023).

Вясна (2021). Душылі падушкай, засоўвалі бутэльку ў рот. На судзе палітвязень Дзядок распавёў пра катаванні і збіццё, 01.07.2021. https://spring96.org/be/news/104081 (доступ 11.10.2023).

Вясна (2022). "Пакаяльныя" відэа: што яны парушаюць і як уздзейнічаюць на чалавека, 26 верасня. https://spring96.org/be/news/109183 (доступ 12.10.2023).

Вясна (2022a). Арыштанта ў ІЧУ Маладзечна прымушалі глядзець выступы Лукашэнкі, стоячы ўсю ноч, 19 мая. https://t.me/viasna96/11296 (доступ 15.10.2023).

Вясна (2023). У Мінгарсудзе пачынаюць судзіць паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева, 14 красавіка. https://spring96.org/be/news/111429 (доступ 15.10.2023).

Вясна (2023a). "Нас убеждали, что мы все сгнием в тюрьмах". История бывшего политзаключенного Дениса Князева, 21 сентября. https://spring96.org/ru/news/112844 (доступ 14.10.2023).

Вясна (2023b). "КГБ думал, что мы ботоферма", — бывшая политзаключённая по "делу Зельцера", 09 апреля. https://spring96.org/ru/news/111381 (доступ 12.10.2023).

Гомельские Ведомости (2022). Послание Главы государства к Национальному собранию и белорусскому народу смотрят и слушают работники трудовых коллективов Центрального района г. Гомеля, 28 января. https://newsgomel.by/archive_news/society/poslanie-glavy-gosudarstva-k-natsionalnomu-sobraniyu-i-belorusskomu-narodu-smotryat-i-slushayut-rabo_73748.html (доступ 13.10.2023).

Государственный ВПК РБ (2017). Портативный нформационный комплекс и устройства для защиты информации представит ОАО МНИПИ на выставке MILEX-2017, 10 апреля. https://vpk.gov.by/news/comm_news/portativnyy_informatsionnyy_kompleks_i_ustroystva_dlya_zashchity_informatsii_predstav (доступ 13.10.2023).

Гулагу-нет (2020). Пытки. Жёсткая приёмка этапа с автозака в СИЗО Минска, Окрестина, 11 октября. https://youtube.com/watch?v=Jb-nYLPVKhUI (доступ 03.10.2023).
Гулицкий, А. (2023). Как связаны зачистка блогеров и беларуский “Х-Фактор”? Мини-расследование KYKY о захвате шоубиза в Беларуси — одной “семьей”, 10 ноября. https://kyky.org/pain/kak-svyazany-zachistka-blogerov-i-belaruskiy-h-faktor-mini-rassledovanie-kyky-o-zahvate-shoubiza-v-belarusi-odnoy-semiey (доступ 18.12.2023).
Демьянов, И. (2020). Лукашенко – разбор голоса и речи. Диктор анализирует голос. *Ставим голос*, 24 августа. https://youtube.com/watch?v=NY-SY4klyHwE (доступ 14.10.2023).
Жизнь-Малина (2023). Ивулин — не пошел на сделку, Глеб опустился до Азарёнка, покушение на Кубракова, Лукашенко и шлёпало. https://youtu.be/psz43wkPoJ0?t=2103 (доступ 11.10.2023).
Зеркало (2022). Для белорусских идеологов выпустили новую методичку — на основе выступления Лукашенко. Рассказываем о пяти открытиях ее авторов, 14 сентября. https://news.zerkalo.io/cellar/22022.html (доступ 13.10.2023).
Зеркало (2022a). Кочанова: воспитатели в детских садах и учителя в школах должны быть еще и идеологами — по-другому сегодня быть не может, 16 ноября. https://news.zerkalo.io/life/26276.html (доступ 13.10.2023).
Зеркало (2022b). Школьников и первокурсников заставили смотреть урок Лукашенко, а районки — писать об этом. Посмотрите на эти фото, 1 сентября. https://news.zerkalo.io/life/21180.html (доступ 13.10.2023).
Зеркало (2022c). Главный идеолог Минобороны Беларуси предложил включать государственный гимн и в детских садах, 31 октября. https://news.zerkalo.io/life/25168.html (доступ 13.10.2023).
Зеркало (2022d). Силовики схватили жителя Могилева, который помогал задержанным за протесты. В “покаянном” видео его заставили петь песню “Любэ” про оперов, 13 октября. https://news.zerkalo.io/life/23926.html (доступ 11.10.2023).
Зеркало (2023). “В связи с последними не совсем правильными событиями”. Детсадовцам будут ставить государственный гимн “ежедневно или еженедельно”, 4 мая. https://news.zerkalo.io/life/13702.html (доступ 28.12.2023).
Зеркало (2023a). “Хотите спокойно учиться, значит, нужно петь гимн”. Поговорили с родителями и детьми о том, как в садах и школах учат быть патриотами, 27 января. https://news.zerkalo.io/life/31173.html (доступ 11.10.2023).
Зеркало (2023b). В Иваново задержали женщину, которая громко слушала дома песню “Україна понад усе!” и подпевала. Ее заставили извиниться и спеть гимн, 3 августа. https://news.zerkalo.io/life/45304.html (доступ 11.10.2023).
Зеркало (2023c). «“Я гуляла по городу”. Могилевчанку задержали за “неправильный” маникюр и попытались снять “покаянное” видео — вот что вышло», 8 сентября. https://news.zerkalo.io/life/48454.html (доступ 12.10.2023).
Колб, А. (2020). Я павінен быў вытрымаць, каб убачыць тых, хто мяне чакаў. *Новы Час*, 16 жніўня, архіўная копія. https://web.archive.org/

web/20211110141111/https://novychas.online/asoba/ja-pavinen-byu-vytrymac-kab-ubaczyc-tyh-hto-mja (доступ 11.10.2023).
КуКу.org (2022). “На телевизоре выключили звук”. Как на самом деле прошел открытый урок Лукашенко — говорят сами школьники, 1 сентября, https://kyky.org/pain/na-televizore-vyklyuchili-zvuk-kak-na-samom-dele-proshel-otkrytyy-urok-lukashenko-govoryat-sami-shkolniki (доступ 13.10.2023).
Кулакова, К. (2023). Ася Булыбенко: В камеру пришел “Цербер”. Он сказал: “Анастасия не исправилась. Анастасия — предатель родины”. *Салідарнасць*, 23 сентября. https://gazetaby.plus/post/asya-bulybenko-v-kameru-prishel-cerber-on-skazal-a/194434/ (доступ 11.10.2023).
Мазур, В. (без даты). Солдат удачи. https://youtube.com/watch?v=wL_hR15kDCA (доступ 14.10.2023).
Минск Новости (2022). Десантники в полевых условиях следили за трансляцией Послания Президента Беларуси народу и парламенту, 28 января. https://minsknews.by/desantniki-v-polevyh-usloviyah-sledili-za-translyacziej-poslaniya-prezidenta-belarusi-narodu-i-parlamentu/ (доступ 13.10.2023).
Наша Ніва (2021). Не калонія і хімія, а арышт — як гэта? Палітвязні адседзелі некалькі месяцаў за надпісы “Жыве Беларусь” і апісалі ўражанні, 22 красавіка. https://nashaniva.com/271865 (доступ 12.10.2023).
Наша Ніва (2021a). Памёр кіроўца аўтобуса, які пасля выбараў быў пара_ нены гранатай, 12 кастрычніка. https://nashaniva.com/279119 (доступ 12.10.2023).
Наша Ніва (2022). Давайце пазбягаць слова “пакаяннае”. Зварот рэдактара “Нашай Нівы”, 16 лістапада. https://nashaniva.com/303276 (доступ 12.10.2023).
Наша Ніва (2022a). У Магілёўскім інстытуце МУС будуць нагадваць пра наяўнасць ворагаў голасам Сталіна, 17 лістапада. https://nashaniva.com/303355 (доступ 14.10.2023).
Наша Ніва (2022b). “Для іх чырвоныя анучы — абраза Лукашэнкі, няведанне гімна і патрыятычныя татуіроўкі”. Брат загінулага добраахвотніка Парфянкова расказаў, як яго катавалі ў ГУБАЗіКу, 7 лістапада. https://nashaniva.com/302613 (доступ 10.10.2023).
Наша Ніва (2022c). Старшыня АГП Мікалай Казлоў пасля выхаду на волю: З'язджаць з Беларусі не збіраюся, 28 сакавіка. https://nashaniva.com/287169 (доступ 12.10.2023).
Наша Ніва (2023). Лукашэнка цяпер не проста хрыпіць, а наогул страціў голас, 21 снежня. https://nashaniva.com/332663 (доступ 22.12.2023).
Наша Ніва (2023a). Азаронак прыйшоў у ГУБАЗіК браць “інтэрв'ю” ў жанчыны — тая дэманстратыўна адмовілася з ім размаўляць, 7 августа. https://nashaniva.com/323480 (доступ 12.10.2023).
Наша Ніва (2023b). “Праз некалькі хвілін вагон пранізалі крыкі Агурбаш”. Прапагандысты звярнулі ўвагу на песні ў цягніках, 12 кастрычніка. http://nashaniva.com/328180 (доступ 13.10.2023).
Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь (2022), Канстытуцыя 1994 года (са змяненнямі і дапаўненнямі). https://pravo.by/pravovaya-informatsiya/pomniki-gistoryi-prava-belarusi/kanstytutsyynae-prava-belarusi/kanstytutsyi-belarusi/kanstytutsyya-1994-goda-sa-zmyanennyami-i-dapa-nennyami2022/index.php#1994-4 (доступ 12.10.2023).

Новая Газета (2020). Крики из изолятора в Минске: как пытают белорусов. И отказываются это признать, 14 августа. https://youtube.com/watch?v=NMr2nkDQTCE (доступ 31.09.2023).

Петров, И. (2023). “Вперед, Россия!”: командир звуковещательной станции показал, как врага в зоне СВО “бьют” песней Газманова. *Российская Газета*, 2 мая. https://rg.ru/2023/05/02/vraga-biut-pesnej-gazmanova.html (доступ 13.10.2023).

Радыё Свабода (2022). “Катуюць беларускім радыё і холадам”. Натальля Хершэ абвясьціла галадоўку ў магілёўскай турме, 31 студзеня. https://svaboda.org/a/31679215.html (доступ 15.10.2023).

Радыё Свабода (2023). “Пасьля вызваленьня я не адчуў сябе свабодным”. Гутарка з былым палітвязьнем пра зьдзекі ў калёніі. https://svaboda.org/a/32225207.html (доступ 15.10.2023).

Радыё Свабода (2023a). “Зараз раскажу, адкуль на Беларусь зьбіраліся напасьці”. Гісторыя аўтаркі відэапародыі на Лукашэнку, 12 ліпеня. https://svaboda.org/a/32498796.html (доступ 12.10.2023).

Салідарнасць (2021). Статкевічу дадалі тры месяцы за кратамі, дзе зьдзекуюцца “дыскатэкай”, 6 студзеня. https://gazetaby.com/post/statkevichu-dadali-try-mesyacy-za-kratami-dze-zdze/172347/ (доступ 15.10.2023).

Сысой, М. (2022). “Мы можем принести себя в жертву. Но это ничего не изменит”. Как белорусы протестуют против войны в Украине. *BBC Russian*, 23 апреля. https://bbc.com/russian/features-61046766 (доступ 11.10.2023).

Сябры (1985). Беларусь Сінявокая. Судьбе Навстречу (альбом). https://youtu.be/IZWhUl3JDW8 (доступ 13.10.2023).

Чык-Чырык (2023). Лукашенко говорит на немецком / откуда на Беларусь готовилось нападение, 26 октября. https://youtube.com/watch?v=jrcMP5yCx-s (доступ 24.12.2023).

Шукюрава, М. (2022). Персанальная камунікацыя.